ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 63 (4315)
СУБОТА, 19 сакавіка 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 63

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Трактарны парк прывесьці ў баявую гатоўнасьць.

Чарговыя задачы работы камсамольскай арганізацыі Беларусі (даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. Жаброўскага на пленуме ЦК ЛКСМБ)—(2-3 ст.).

Увесь калгасны актыў — на ажыцьцяўленьне пастановы ЦК КП(б)Б. Змагацца за поўнае выкананьне пляну лесавывазкі — па-баявому рыхтавацца да сплаву (1 стар.).

Больш канкрэтнай дапамогі, больш аперацыйнага кіраўніцтва перабудовай прафработы на аснове 6 умоў тав. Сталіна (VII усебеларускі зьезд прафсаюзаў)—(3 стар.).

Японцы ўмацоўваюць пазыцыі ў раёне Шанхаю. Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі (4 стар.).

ТРАКТАРНЫ ПАРК ПРЫВЕСЬЦІ Ў БАЯВУЮ ГАТОЎНАСЬЦЬ

На гледзячы на тое, што да выхаду ў поле засталіся літаральна лічаныя дні, рамонт трактараў і с.-г. інвэнтару праходзіць надзвычай марудна. На 10 сакавіка толькі Слуцкая МТС і с.-г. майстэрня скончылі рамонт трактараў. Плян рамонту трактараў па рэспубліцы выкананы усяго на 57,7 процантаў.

Аспоўную масу трактараў і с. г. інвэнтару павінны адрамантаваць майстэрні МТС. На 10 сакавіка майстэрні трактарацэнтру сваіх трактараў адрамантавалі толькі 650 шт., або 64,8 проц. Плян рамонту іншых сыстэм выкананы на 58,3 проц.

Яшчэ горш праходзіць рамонт па саўгасах, якія павінны адрамантаваць 668 трактараў, а адрамантавалі толькі 370. Такім чынам, **трактарны парк напалову знаходзіцца ў непрацаздольным стане.** Зацяжка рамонтнай кампаніі патрабуе, каб у дні, што засталіся да пачатку выхаду ў поле, работа ў майстэрнях праходзіла ўдарнымі тэмпамі. Неабходна прылажыць максымум сіл і энэргіі, каб ні адной машыны не засталося неадрамантаванай.

Адначасова трэба ўзяць пад строгі кантроль грамадзкасьці якасьць рамонту трактараў. Матар'ялы, якія мы сёньня друкуем аб якасьці рамонту трактараў у Аршанскай МТС, сьцвярджаюць нам аб тым, што агенты кляса-ворага, якія пралезьлі ў майстэрню, імкнуцца сарваць пасьпяховую падрыхтоўку да веснавой пасеўнай кампаніі. У выніку адсутнасьці тэхнічнага нагляду, 18 трактараў, якія лічыліся адрамантаванымі, аказаліся нягоднымі для работы. Рамонт быў праведзен яўна шкодніцкі. Урокі Аршанскай МТС павінны паслужыць перасьцярогай для другіх майстэрань. Трэба дабіцца таго, каб ні адзін трактар пасьля рамонту не застаўся неправераным. Толькі тады, калі прыёмчая камісія прызнае, што рамонт быў праведзен добраякасна, толькі тады можна лічыць трактар адрамантаваным. Трэба ўстанавіць брыгадную адказнасьць за якасьць рамонту, разам з тым устанавіўшы персанальную адказнасьць старшых брыгадзіраў.

[illegible] абліва недапушчальным трэба [illegible] ход рамонту прычэпнага інвэнтару і транспартных сродкаў. Плян [illegible] плугоў выкананы на 32,3 [illegible] — 58,5 проц. Няма патрэбы доказваць, якую небясьпеку выклікае далейшая зацяжка рамонту, асабліва, калі прыняць пад увагу што тэмпы рамонту ня маюць тэндэнцыі для паростаньня. У параўнаньні з мінулай пяцідзеўкай, апошняя дала прырост па плугох усяго на 4,8 проц., сявярках—9,8 проц. Зразумела, што калі ў далейшым рамонт будзе праходзіць такімі тэмпамі, дык гэта азначае, што ў часе палавых работ мы ня зможам цалкам скарыстаць увесь с.-г. інвэнтар, што пацягне за сабой расьцягваньне тэрмінаў сяўбы і паніжэньне ўраджайнасьці.

На рамонце транспартных сродкаў прырост у параўнаньні з мінулай пяцідзеўкай складае ўсяго 5,2 проц.

Аспоўнай прычынай невыкананьня пляну зьяўляецца дрэнная арганізацыя працы ў рамонтных майстэрнях і кузьнях. 6 умоў тав. Сталіна далёка ня ўсюды пакладзены ў аснову арганізацыі працы. Падзённічына і раўнілаўка зьяўляюцца галоўнейшымі прычынамі, якія зьніжаюць тэмпы ра[illegible].

Факты аб рабоце Слуцкай МТС досыць выразна паказваюць, каб бачыць, што посьпех у рамонтнай кампаніі быў дасягнут іменна на аснове правільнай арганізацыі працы, пры ўмове разгортваньня сацпаборніцтва і мабілізацыі ўсяго актыву рабочых вакол выгворчай праграмы. Прыклад Слуцкай МТС паказвае, што справа не ў недахваце запасных частак і матар'ялаў, як гэта імкнуцца тлумачыць некаторыя работнікі другіх майстэрань, а справа заключаецца ва ўменьні прапаваць і кіраваць па-новаму.

Раённыя партыйныя, савецкія і земельныя арганізацыі павінны сабе ўявіць, што партыя і надалей будзе весьці рашучую барацьбу з «кіраўнікамі», якія сваёй апартуністычнай бязьдзейнасьцю, стаўкай на самацёк вяваюць падрыхтоўку да трэцяй бальшавіцкай вясны. Гэтым гора-«кіраўніком» не дапамогуць ніякія спасылкі на «аб'ектыўныя» прычыны. Адказнасьць за сваячасовую падрыхтоўку інвэнтару і трактараў да вясны нясуць усе раённыя арганізацыі. Тым больш ня могуць быць прыняты пад увагу «аб'ектыўныя» прычыны ў апраўданьне марудных тэмпаў рамонту прычэпнага інвэнтару і транспартных сродкаў. На мясцох ёсьць усе ўмовы і магчымасьці для таго, каб поўнасьцю адрамантаваць плугі, сявяркі і транспарт. Але для гэтага трэба правяць ініцыятыву, дабіцца поўнай нагрузкі вясковых кузьняў, мабілізаваць масы калгасьнікаў, камсамольцаў і ўвесь вясковы актыў па зборы і выяўленьні ўнутраных рэсурсаў для рамонту с.-г. інвэнтару.

Раённыя арганізацыі павінны аддаць таксама адпаведную ўвагу падрыхтоўцы інвэнтару аднаасобнага сэктару, дзе плян рамонту на плугох выкананы на 20,7 проц. і транспартных сродках—на 20,5 проц. Існуючая недаацэнка аднаасобнага сэктару, якая мае месца ў некаторых раёнах, павінна быць зжыта. Разам з тым трэба даць рашучы адпор кулацкім тэндэнцыям праводзіць рамонт інвэнтару на аднаасобным сэктары за некалькі дзён да сяўбы. Рамонт інвэнтару як па сацыялістычным, так і аднаасобным сэктары павінен быць скончан да пачатку палавых работ.

Барацьба за ўраджай патрабуе сваячасовай падрыхтоўкі ўсіх сродкаў, у тым ліку с.-г. машын і інвэнтару. Усякая недаацэнка і спасыланьні на «аб'ектыўныя» прычыны павінны разглядацца, як праяўленьне апартуністу на практыцы. Сёлета мы павінны правесьці сяўбу ў максымальна-кароткі тэрмін з тым, каб забясьпечыць павышэньне ўраджайнасьці. Задача раённых арганізацый дабіцца таго, каб увесь трактарны парк і с.-г. інвэнтар да пачатку палавых работ быў прыведзен у баявую гатоўнасьць.

УВЕСЬ КАЛГАСНЫ АКТЫЎ НА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ПАСТАНОВЫ ЦК КП(б)Б

Аб пяцідзеньніку рэалізацыі аблігацыйнасеннай пазыкі

Да ўсіх раённых і нізавых калгасных насьценных газэт і селькораў, да ўсіх калгассаюзаў, калгасаў і калгаснікаў-ударнікаў

Адказнейшым і важнейшым зьвяном на даным этапе ў падрыхтоўцы да трэцяй бальшавіцкай вясны зьяўляецца сваячасовае і 100 проц. выкананьне пляну па стварэньні насенных і страхавых фондаў.

Адстаўваньне перата раду раёнаў і калгасаў у выкананьні гэтай задачы ставіць пад пагрозу правядзеньне веснавой кампаніі. Кулак з дапамогай сваёй агентуры — правых і «левых» апартуністаў — прыкладае ўсе свае сілы па тое, каб сарваць работу па стварэньні насенных і страхавых фондаў, агітуе за іх разбазараваньне і расьцягваньне, імкнецца сарваць падрыхтоўку да трэцяй бальшавіцкай сяўбы.

У сучасны момант уся сіла, уся энэргія раённага, нізавога калгаснага друку і селькораў, калгассаюзаў, калгасаў і калгаснікаў павінна быць накіравана на самую настойлівую барацьбу за стварэньне насенных і страхавых фондаў.

ЦК УсеКП(б) і СНК СССР у сваёй пастанове «паказваюць усім партыйным і савецкім арганізацыям на тое, што цэнтральнай задачай іх работы па вёсны зьяўляецца стварэньне насенных калгасных фондаў у разьмерах, неабходных для поўнага выкананьня пасеўнага пляну».

Насеньне бясспрэчна ёсьць, толькі трэба разгарнуць самую шырокую масавую работу па яго зборы.

Трэба разьвіць самую энэргічную работу па мабілізацыі ўнутраных насенных рэсурсаў, якія ёсьць у калгаснікаў.

Адным з дзейсным сродкаў у мабілізацыі ўнутраных насенных рэсурсаў зьяўляецца распаўсюджаньне аблігацый насеннай пазыкі імя конкурсу «Правды».

Пастановай ЦК КП(б)Б абвешчан пяцідзесьнік рэалізацыі насеннай пазыкі. Гэты пяцідзесьнік павінен быць неадкладна праведзен і стаць справай усёй пралетарскай грамадзкасьці БССР, усёй калгаснай сыстэмы, усіх газэт і селькораў.

Раённыя газэты, насьценныя газэты калгасаў, селькоры павінны энэргічна ўзяцца за распаўсюджаньне насеннай пазыкі. Трэба дабіцца, каб кожны калгаснік БССР прыняў актыўны і непасродны ўдзел у стварэньні насенных фондаў.

Цэнтр цяжару барацьбы за насеньне трэба перанесьці непасродна ў калгасную брыгаду. Брыгада праз мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў сваіх калгаснікаў павінна поўнасьцю забясьпечыць насеньнем выкананьне пасеўнага пляну прымацаваных да яе вучасткаў. Брыгады, якія ўжо забясьпечаны насеньнем, праз распаўсюджаньне пазыкі павінны аказаць сацыялістычную дапамогу тым брыгадам і калгасам, дзе свайго насеньня не хапае.

«Зьвязда», Калгасцэнтр БССР і «Рабселькор» зварачаюцца да ўсіх райкалгассаюзаў, калгасаў і калгаснікаў-ударнікаў, раённых і нізавых калгасных газэт, селькораў БССР разгарнуць самую шырокую работу па распаўсюджаньні аблігацый насеннай пазыкі. Стварайце спэцыяльныя аперацыйныя брыгады з калгаснікаў-ударнікаў і селькораў. Мабілізуйце ўвесь калгасны актыў на ліквідацыю адставаньня на гэтым важнейшым вучастку падрыхтоўкі да сяўбы.

Трэба на старонках раённых і нізавых газэт устанавіць сыстэматычныя зводкі ходу распаўсюджаньня пазыкі, адзначыць сыстэматычна лепшых калгаснікаў-ударнікаў і селькораў па стварэньні насенных фондаў.

Разгортваючы масавую работу пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый, раённы і нізавы друк і рабселькоры БССР разам з райкалгассаюзамі і праўленьнямі калгасаў, апіраючыся на пастаянную брыгаду і калгасны актыў, павінны забясьпечыць рашаючыя перамогі на фронце барацьбы за насеньне, на фронце барацьбы за ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4-га лютага.

«ЗЬВЯЗДА».
КАЛГАСЦЭНТР БССР.
«РАБСЕЛЬКОР».

Брыгады па рэалізацыі аблігацый насеннай пазыкі

ЛЁЗНА. (Па тэлефону ад нашага спэцкора).

Па ініцыятыве райжанарганізатара і рэдакцыі газэты «Ленінскі шлях» дзлегацкі сход жанчын мястэчка Лёзна ў ліку 25 чалавек арганізаваў 6 брыгад па рэалізацыі аблігацый насеннай пазыкі. Тры брыгады разам з камсамольцамі мястэчка прыступілі да работы 17 сакавіка. Апрача таго, рэдакцыя «Ленінскага сьцягу» накіравала ў сельсаветы і калгасы брыгады па рэалізацыі аблігацый насеннай пазыкі і арганізацыі міжкалгаснай насеннай пазыкі.

МІКУЦКІ.

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). Калгаснікі калгасу **«Новыя Гараны»** падхапілі пачынаньне перадавых калгасаў і падпісаліся на насенную пазыку на 1.000 пуд. бульбы. Камуна **«Чырвоны артылерыст»** пасьледавала прыкладу калгасу «Новыя Гараны» і таксама падпісалася на насенную пазыку на 400 пуд. бульбы.

Зараз праводзіцца работа па рэалізацыі насеннай пазыкі ва ўсіх калгасах Полаччыны. **А. Шустры.**

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

СКОНЧЫЛІ ЗБОР НАСЕНФОНДАЎ

Жыткавіцкі раён. Калгасы: **«Ленінская Беларусь», «Чырвоная ніва», «Камінтэрн», «Савецкая Беларусь», «Чырвоны маяк», »Прамень камуны», Полацкі раён.** Калгас **«Новыя гараны».**

Слуцкая МТС скончыла рамонт трактараў

СЛУЦАК. Машына - трактарная і Слуцкая сельска - гаспадарчая майстэрня скончылі рамонт трактараў. Майстэрня МТС правусьціла праз капітальны і сярэдні рамонт 40 трактараў і 18 блёкаў. Апрача таго, пры дапамозе МТС адрамантавана непасродна ў саўгасах яшчэ 10 трактараў. Такім чынам майстэрня МТС адрамантавала 68 трактараў.

Сельска - гаспадарчая майстэрня прамыслова - каапэрацыйнай арцелі адрамантавала 3 трактары і 12 блёкаў саўгасам Слуцкага і суседніх раёнаў.

Гэта буйнейшая перамога атрымана дзякуючы таму, што партарганізацыя і дырэкцыя МТС адалі максымум увагі правільнай арганізацыі працы ў майстэрні на аснове рэалізацыі шасьці ўмоў тав. Сталіна. На працягу ўсёй рамонтнай кампаніі асноўныя работы праводзіліся вызьзельна. Была ўстаноўлена адказнасьць брыгад за якасьць рамонту. У рамонце прымалі ўдзел ня толькі рабочыя МТС, але і 24 чалавека курсантаў - мэханікаў. Два разы абвешчаліся дакладнікі пітуму.

На сумесным урачыстым сходзе рабочых сельска - гаспадарчай майстэрні і МТС былі падведзены вынікі работы. 11 лепшых ударнікаў — т. т. Грэскі, Дзярэча, Маглыш Янка, Лясун, Ацюк, Гурскі, Раговін, Пацыкайлін, Левус і іншыя прэміраваны.

Зараз МТС пераключылася на рамонт сельска - гаспадарчага і прычэпнага трактарнага інвэнтару ў калгасах. Дзіве брыгады рабочых накіроўваюцца для правядзеньня рамонту непасродна ў калгасах.

Б. Харытончык.

Шкодніцтва ў Аршанскай рамонтнай майстэрні

18 трактараў патрабуюць паўторнага рамонту

ВОРША. Яшчэ з пачатку сьнежня Аршанская МТС прысупіла да рамонту трактараў. Былі складзены тры брыгады, на чале з брыгадзірамі т. т. Бязлюдным, Крукоўскім і Кухаравым. У канцы лютага працаўнікі майстэрні заявілі, што з 22 трактараў 18 гатовы для працы. Але варта было праверыць якасьць рамонту, як выявілася што гэтыя абіцаньні зьяўляюцца нічым іншым, як «очкавтирательством», каб скрыць простае шкодніцтва.

Праверка ўсіх 18 трактараў, якія лічыліся адрамантаванымі, паказала, што ні адзін трактар пальга пусьціць у ход. Пры разборцы трактараў аказалася, што ў шатунных падшыпніках забыты азбестам шчыліны для змазкі. Пры заліўках у блёках каронных і шатунных падшыпнікаў аказалася, што апошнія ня прыгнаны да шыек калянчатага вала. Пры працэдуры клапанаў матор не прамываўся і ў спрэдзіне заставаўся пяздак. Шатуны, якія злучаюцца з калянчатым валом, былі злучаны балтамі з сарданай разьбой. Рэзультатам гэтага шкодніцтва зьяўляецца тое, што як спэцыялісты, так і адміністрацыя ня цікавіцца якасьцю рамонту. Культурна - масавая работа сярод рабочых ніякая не праводзіцца. Рабфком МТС бязьдзейнічае.

Гэтай справай павінна зацікавіцца Беларускае Трактарацэнтру, дабіцца выяўленьня віноватых у шкодніцтве і прыцягнуць іх да адказнасьці.

Г. Багумілаў.

Змагаючыся за поўнае выкананьне пляну лесавывазкі— па-баявому рыхтавацца да сплаву

УЗЯЦЬ БАЯВЫЯ ТЭМПЫ

У лесасплаўную кампанію бягучага году Лесбелам павінна быць сплаўлена 2.864 тыс. кбм. лесаматар'ялу і 695 тыс. кбм. дроў. Каб з посьпехам ажыцьцявіць гэтую праграму, трэба ўжо зараз па-баявому разгортваць падрыхтоўку.

Аднак, становішча па сёньняшні дзень сьведчыць, што гэты вучастак работы яўна недаацэньваецца. Падвозка лесаматар'ялу да прыстаняй — адна з асноўных частак падрыхтоўчых работ — праходзіць нездавальняюча: на 10 сакавіка заданьне выканана толькі на 60 проц. Прычым і гэта колькасьць ня раз сартавана па гатунках.

Ня ўлічана і грузападзёмасьць невялікіх рэчак. Да некаторых прыстаняй падвезена лесу ў 3-4 разы больш патрэбнага (Рэчыцкі вучастак Бярэзіна-Дняпроўскай лесасплаўнай канторы). Гэта здарылася таму, што ў работе леспрамгасаў і лесасплаўных кантор няма ўвязкі.

Лесбел у гэтым пытаньні таксама дапусьціў памылку.

— Увесь лес вывозіць да бліжэйшых прыстаняй, — дае ён дырэктыву леспрамгасам. Колькі лесу можна сплавіць па тэй ці іншай рэчцы, выходзячы з яе глыбіні і працяжнасьці разьліву — Лесбелам пад увагу ня прынята. Зараз ліпкі лесу прыходзіцца перавозіць ад адной прыстані да другой, што ня можа не адбіцца на павышэньні сабекошту ўраўніны.

Дрэнная справа і з загатоўкай увязачнага матар'ялу. На 10 сакавіка гужбы падрыхтавана толькі 35 проц. патрэбнай колькасьці, пры чым яна яшчэ не разьмеркавана па прыстанях.

Пагражаючае становішча з забясьпячэньнем сплаву рабочай сілай. У гэтай справе вінаваты ня толькі Лесбел, але і сэктар кадраў Наркампрацы, які толькі ў пачатку сакавіка паслаў лесасплаўным канторам разьмеркаваньне раёнаў вярбоўкі рабочых. Паводле пляну рабочых-сплаўшчыкаў патрэбна 27.900 чал. Аднак ні адна лесасплаўная кантора яшчэ не пачала вярбоўкі. Вярбовачнага апарату ў сэктары сплаву Лесбелу і па мясцох няма. Тыповы дагавор, які павінен заключацца з калгаснікамі, дагэтуль ня распрацаваны.

Важнейшай умовай посьпеху лесасплаву зьяўляецца правільная арганізацыя працы і сыстэмы аплаты сплаўшчыкаў. Між тым, гэтаму вучастку сэктар сплаву Лесбелу і ЦП саюзу лесдрэўрабочых не аддаюць патрэбнай увагі. У бягучым годзе ўсе сплаўныя работы павінны быць пераведзены на брыгадны мэтад. Зразумела, якасьць работы брыгады ў значнай меры залежыць ад брыгадзіра. Таму па падбор брыгадзіраў павінна быць зьвернута асаблівая ўвага. Лесбел і лесасплаўныя канторы зрабілі ў гэтым напрамку вельмі мала. Усяго патрэбна 250 брыгадзіраў. Пакуль завербавана толькі 200. Курсы брыгадзіраў пачнуць сваю працу не раней 20 сакавіка. Гэта значыць, што праца іх будзе скамечана. Няма цьвёрда ўстаноўленых норм выпрацоўкі і расцэнак.

Лесасплаўныя канторы, асабліва іх вучасткі, адчуваюць вялікую патрэбу ў тэхнічных кадрах. Але сэктар сплаву Лесбелу ня ведае, хто колькі патрабуе дзесятнікаў і гідратэхнікаў. Адсутнасьць такіх вестак не дае магчымасьці сэктару кадраў Наркампрацы вылучыць поўную колькасьць работнікаў.

Трэба дабіцца пералому ў падрыхтоўцы да сплаву. Апартуністычнай бязьдзейнасьці і абломаўскай непаваротлівасьці лесасплаўных арганізацый трэба палажыць канец.

Вярбоўка плытагонаў не распачалася

БАБРУЙСК. (Наш кар.).

Падрыхтоўка да лесасплаву па **Бярэзіна-Дняпроўскай лесасплаўнай канторы** належнымі тэмпамі не разгарнулася. Калі з загатоўкамі такелажу і гужбы справа стаіць больш менш задавальняюча, дык пагражаючае становішча з наборам рабочай сілы, які яшчэ не распачаўся.

Падвозка лесу да прыстаняй таксама ідзе нездавальняюча. На сёньняшні дзень падвезена ня больш 40 проц. заданьня. Леспрамгасы нядбайна адносяцца да выкананьня пунктаў дагавораў аб сартаваньні лесаматар'ялу. Чэрвеньскі, Магілеўскі, Бярэзінскі, Крупскі і Бялыніцкі леспрамгасы зусім не праводзяць сартаваньня.

Слаба праходзіць і рамонт маторнага флёту, які знаходзіцца ў карыстаньні канторы. Завод імя Варашылава павінен быў скончыць да 10 лютага рамонт паравой машыны, але і дагэтуль яшчэ работу ня скончыў. Рамонт матораў і карпусоў маторных лодак толькі што распачаўся.

Паводле папярэдніх памаўчаньняў сплаўная кантора ў першым квартале павінна атрымаць 75 проц. прадуктаў і промтавараў патрэбных на ўвесь сэзон. Паступіла-ж зусім незначная колькасьць. Кіраўніцтва канторы і праўленьне леспрабкопу на сёньняшні дзень ня ведаюць колькі і дзе патрэбна адкрыць сталовак і ларкоў для абслугоўваньня лесасплаўшчыкаў.

Д. і М.

Зрываецца пабудова лесасплаўнай запруды

У вёсцы **Асманы** на раце Осьліх распачата пабудова новай лесасплаўнай запруды, якая павінна быць скончана да пачатку лесасплаўнай кампаніі. Аднак, тэмпы будаўніцтва далёка не забясьпечваюць скапчэньне яго ў тэрмін.

Прычына гэтаму тая, што, **Бялыніцкі леспрамгас, які зьяўляецца асноўным пастаўшчыком лесаматар'ялу, злачынна зрывае яго дастаўку.** Былі выпадкі, калі з-за недахвату лесаматар'ялаў будаўніцтва спынялася на некалькі тыдняў, а рабочыя распускаліся па дамох. У выніку 25 цесьляроў і пыльшчыкаў зусім пакінулі работу. Зараз хаця будаўніцтва аднавілася, але тэмпы яго ўсё яшчэ невыстарчальныя. Бялыніцкі РВК павінен прыняць належныя захады да леспрамгасу, які зрывае дастаўку лесаматар'ялу.

КАЧЫНСКІ.

Рэчыцкі РВК недаацэньвае падрыхтоўкі да лесасплаву

РЭЧЫЦА, (Наш кар.).

Рэчыцкі вучастак Бярэзіна - Дняпроўскай лесасплаўнай канторы вельмі марудна рыхтуецца да лесасплаву. Асноўная работа — вярбоўка рабочых, — дагэтуль яшчэ не распачалася. Прыстані не ўмацоўваюцца, у выніку чаго падвезены лес у самы разьліў можа быць сьнесен вадой. Не забясьпечаны прыстані такелажам, гужбой і іншымі рэчамі, якія патрэбны для сплаву.

Для таго, каб падвесьці да прыстаняй гужбу і такелаж леспрамгас перакінуў з лесазывазкі 20 калгасных фурманак. Але РВК забараніў леспрамгасу гэту справу, «матывуючы», што гэта перашкаджае выкананьню пляну лесазывазкі. Лесасплаўная кантора ву частку для вырабу тоўнаў і такелажу заключыла дагавор з брыгадай спецыялістаў, якія раней працавалі на лесазагатоўках. РВК таксама скасаваў гэты дагавор. Тут выяўляецца спаўка на «чарговасьць» кампаній. Райрабатком леспрэўрабочых ніякай працы па падрыхтоўцы да лесасплаву не праводзіць.

Дадатковыя паўнамоцтвы ўраду

—гэта новы лес шыбеніц, гэта паскарэньне тэмпаў падрыхтоўкі інтэрвэнцыі супроць СССР

Выступленьне камдэпутата Роэнбэрга

ВАРШАВА, 16. 14 сакавіка ў польскім сойме пры абгаварэньні пытаньня аб прадаўжэньні надзвычайных паўнамоцтваў прэзыдэнту, выступіў **камуністычны дэпутат Роэнбэрг.** Роэнбэрг заявіў: «Камуністычная фракцыя сойму з усёй энэргіяй будзе змагацца супроць закону аб дадатковых паўнамоцтвах ураду, бо гэты закон зьяўляецца асновай для новых атак на правы і інтарэсы мільённых працоўных мас у Польшчы. **Закон азначае таксама падрыхтоўку да імпэрыялістычнай вайны супроць Савецкага Саюзу.**

Увесь судова-паліцэйскі апарат фашысцкага тэрору ў поўнай згодзе з усёй соймавай «апазыцыяй» атрымлівае новую зарадку. Такім чынам **лес шыбеніц будзе пашырацца з максымальнай хуткасьцю.** Паўнамоцтвы, якія вы зацьвярджаеце, гэта — адказ фашысцкай дыктатуры на стойкія гераічныя забастоўкі ў Дамброве, Верхняй Сілезіі, Петракове і т. д. на ровалюцыйныя выступленьні сялян супроць падатковага цяжару. У часе апошніх фашысцкіх замахаў і забастовачнага руху працоўных мас, асобная роля ўскладзена на правадыроў НПС — найбольш верных агентаў капіталу і фашызму.

Фашысцкая ўлада імкнецца зламаць забастоўку голадам

Паліцыя канфіскуе хлеб, сабраны для галадаючых гарнякоў

ВАРШАВА, 16. 18 сакавіка канчаецца месяц з дня абвешчаньня забастоўкі гарнякоў Дамброўскага і Кракаўскага вугольных басэйнаў. **Гераічная барацьба гарнякоў ня спыняецца наперакор паліцэйскаму тэрору і здрадніцкай тактыцы фашысцкіх і сацыял-фашысцкіх саюзаў, наперакор голаду і галечы, якія ахапілі гарняцкія сем'і.** У гэтай абстаноўцы **жанчыны-гарнячкі праявілі выключную ўпартасьць і гераізм.** У апошнія дні барацьба абвастрылася яшчэ больш у сувязі з пастановай папэсаўцаў у Кракаўскім басэйне здрадзіць забастоўцы. Апіраючыся на гэту пастанову, прадпрыемцам удалося адкінуць работу на некаторых капальнях Дамброўскага і Кракаўскага басэйнаў. Абуранымі здрадніцтвам сацыял-фашысцкіх лідэраў, рабочыя на капальнях «Нікіш», «Пяскаў» і «Моджыеў» прагналі сацыял-фашыстаў і стварылі свае выбарныя камітэты барацьбы. Рабочыя правялі на капальні «Ловіш» дэманстрацыйную італьянскую забастоўку і прагналі штрэйкброхэраў. **У адказ на гэта паліцыя канфіскавала хлеб, сабраны прафсаюзнай левай, які раздаваўся галадаючым гарняцкім сем'ям.**

(ТАСС).

Новы замах на зарплату мэталістаў у Польшчы

ВАРШАВА, 1. Саюз прадпрыемцаў мэталюргічнай і мэталяапрацоўчай прамысловасьці ў Верхняй Сілезіі абвясьціў аб зьніжэньні зарплаты рабочым на 20 проц. з 1 красавіка.

Генэральны сакратар літоўскай урадавай партыі Таўцінікаў--у Вільні

ВАРШАВА, 16. **«Ілюстраваны Курэр Цодзенны»** паведамляе, што з Коўна прыехаў у **Вільню** генэральны сакратар літоўскай урадавай партыі таўцінікаў—**Растэніс.** Растэніс канфераваў з прадстаўнікамі віленскага літоўскага камітэту.

«ІКЦ» падкрэсьлівае вялікае палітычнае значэньне прыезду, асабліва ў сувязі з абвастрэньнем літоўска-нямецкіх адносін.

Аднаасова газэта паведамляе, што выдатны **пілсудчык Лядніцкі** атрымаў ад літоўскага ўраду **візу на прыезд у Літву.**

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ ТАСС

Лондаўскія «Дэйлі Геральд» і «Дэйлі Уоркер» (камуністычная) 15 сакавіка г. г. апублікавалі паведамленьні агенцтва «Эксчэнд тэлеграф» аб меўшай быццам месцы сутычцы савецкай пагранічнай аховы з часьцямі японскіх войск на «сібірскай граніцы». Паводле тых-жа паведамленьняў японскі самалёт, які пераляцеў быццам праз граніну каля станцыі Патраніхвая, «быў акружан савецкімі самалётамі і вымушан зьнізіцца».

З аўтарытэтнай крыніцы ТАСС'у паведамілі, што апублікаваныя пазазалымі вышэй газэтамі паведамленьні агенцтва «Эксчэнд тэлеграф» не адпавядаюць сапраўднасьці. Ніякіх сутычак паміж пагранахавай СССР і японскімі войскамі ня было і самы факт набліжэньня японскіх войск да граніцы паміж СССР і Кітаем (Маньчжурыя) ніадзе да гэтага часу не адзначаўся і ніякіх палётаў японскай авіяцыі над тэрыторыяй СССР таксама не зарэгістравана.

Пастанова Калегіі Народнага Камісарыяту фінансаў БССР

1. Адзначыць, што фінансавыя, савецкія, гаспадарчыя і грамадзкія арганізацыі Гомелю і Тураўскага раёну па працягу ўсяго кварталу праводзілі энергічную, ударную масавую і аперацыйную работу па выкананьні фінансавага пляну і што дзякуючы гэтай ударнай бальшавіцкай мабілізацыі працоўных мас і пралетарскай грамадзкасьці забясьпечыў датэрміновае выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў 1-га кварталу — Гомель на 100,5 проц., Тураўскі раён — на 105,4 проц.

У сувязі з гэтым прасіць Савет Народных Камісараў БССР—за ўдарную работу, за бальшавіцкія тэмпы па выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў насельніцтва павялічыць мясцовыя бюджэты па камунальна - жыльёвае і культурнае будаўніцтва па Гомелі — на 300 тыс. руб. і па Тураўскім раёне — на 50 тыс. руб.

2. Прымаючы пад увагу, што на тлеадзячы на неадпаразовыя папярэджаньні і катэгарычныя дырэктывы, Цухавіцкі раён выканаў заданьне па мабілізацыі сродкаў насельніцтва на 10/III—57,5 проц., Талачынскі раён —51,4 проц., Веткаўскі — 44,4 проц., што роўналежна зрыву фінансавага пляну і бюджэту па гэтых раёнах.

Выходзячы з вышэйадзначанага паставіць перад урадам БССР пытаньне аб скарачэньні мясцовых бюджэтаў гэтых раёнаў на 10 проц.

3. Папярэдзіць адстаючыя раёны: Барысаўскі, Рагачоўскі, Жлобінскі, Шклоўскі, Пружкі, Гарадоцкі, Лоеўскі, Бярэзінскі і Бялынічы, што ў выпадку непрыняцьця імі рашучых мер, якія забясьпечылі-б безадкладны пералом у рабоце і поўнае выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў 1-га кварталу, НКФ БССР будзе пастаўлена пытаньне перад урадам БССР аб скарачэньні аб'ёму мясцовых бюджэтаў азначаных раёнаў.

4. Папярэдзіць райфа і райвыканкомы ўсіх раёнаў, што ў будучым, па працягу ўсяго 1932 г. забясьпячэньне сродкамі мясцовых бюджэтаў Народны камісарыят фінансаў будзе стаіць у непасроднай залежнасьці ад фінансавай і гаспадарчай работы, ад выкананьня раёнамі і гарадамі сваіх пляноў мабілізацыі сродкаў.

5. Народны камісарыят фінансаў БССР абавязвае райфа ўсіх раёнаў, ня выкананых квартальны плян мабілізацыі сродкаў да 15 сакавіка, усіх сваіх ўпаўнаважаных, фінансавыя брыгады, работнікаў накіраваных на дапамогу па складаньні фінансавагаствочых пляноў у калгасы, зараз жа па-бальшавіцку разгарнуць масавую і аперацыйную работу, ударнымі тэмпамі забясьпечыць выкананьне і перавыкананьне фінансавага пляну 1-га кварталу заключнага году пяцігодкі.

Народны камісар фінансаў БССР
А. ХАЦКЕВІЧ.

Выкананьне прамфінпляну

прамысловасьцю Наркамснабу БССР за першую дэкаду сакавіка месяца

Паводле зводкі Наркамснабу БССР прамысловасьць Наркамснабу ў першую дэкаду сакавіка выканала 29,1 проц. месячнага пляну, у тым ліку **кандытарска - макаронная** прамысловасьць дала выкананьне месячнай праграмы на 98,1 проц.; **Белбродабъединаньне** — 113,5 проц.; **масла-мар-гарынная** прамысловасьць — 59,1 проц., у тым ліку плян па масьле выкананы на 93,8 проц.; па макусе—на 87,1 проц., па наволі — на 30,1 проц. Прамысловасьць **Белкантары Саюзхлеба** выканала месячную праграму на 120,1 проц.; **Белтутюнкапрадукт** —221,7 проц.; **Гомельпрам** — 98,6 процантаў.

Чарговыя задачы работы камсамольскай арганізацыі Беларусі

Даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. ЖАБРОЎСКАГА на пленуме ЦК ЛКСМБ

Таварышы, пленум ЦК ленінскага камуністычнага саюзу моладзі Беларусі, які зараз адбываецца, склікан пасля XVII усесаюзнай партканферэнцыі, якая вынесла пастановы сусьветна-гістарычнага значэньня, пасьля XIV зьезду КП(б)Б і пасьля ўсебаковага абсьледваньня, усебаковай праверкі ЦК УсеЛКСМ работы беларускай камсамольскай арганізацыі.

Гэты пленум, які падводзіць вынікі работы, мае вялізарнейшае палітычнае арганізацыйнае і выхаваўчае значэньне ў жыцьці і рабоце беларускага камсамолу.

Даны пленум ЦК біясьпрочна павінен стаць і стане паваротным пунктам, які знаменуе карэнны паварот камсамолу Беларусі, пачынаючы ад ЦК камсамолу і канчаючы нізавымі камсамольскімі зьвенымі, камсамольскімі ячэйкамі, камсамольскімі групамі, у бок дзейснага, практычнага, арэрацыйнага, канкрэтнага, штодзённага ператварэньня ў жыцьцё пастаноў XVII усесаюзнай партыйнай канферэнцыі, XIV партыйнага зьезду КП(б)Б і пастановы, вынесенай ЦК УсеЛКСМ

Посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва забясьпечаны няўхільным ажыцьцяўленьнем генэральнай лініі партыі

Пленум ЦК ЛКСМБ сабраўся на надзвычай важным гістарычным этапе нашай пралетарскай рэвалюцыі. Гэты этап характарызуецца перамогамі сусьветна-гістарычнага значэньня, ат рымаемі рабочай клясай нашай савецкай краіны, пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, яе ЦК і правадыра партыі і сусьветнага пралетарыяту таў. Сталіна, перамогамі, якія канчаткова і бесваротна з пункту погляду ўзмацнаньня клясавых сіл, унутры нашай савецкай краіны, вырашылі карэнные пытаньне пралетарскай рэвалюцыі. Ленінскае пытаньне «хто каго» і ў прамысловасьці, і ў сельскай гаспадарцы цалкам і бесваротна вырашана на карысьць сацыялізму. Мы завяршылі пабудову фундамэнту сацыялістычнай эканомікі.

З адсталай, зьбяднелай, поўнагалоднай царскай Расіі, якая зьяўляецца турэмнай народаў, эўрапэйскім жандарам, з краіны самага дробнага і драбнейшага зямляроблства, мы ўзышлі на працягу 10 год мірнай будаўнічай работы нашу краіну на нябывала высокі ўзровень, на ўзровень перадавой буйнай сацыялістычнай індустрыі, перадавой буйнай тэхнікі, на ўзровень самага буйнага ў сьвеце сацыялістычнага земляроблства.

Гэтым самым рабочая клясa СССР, пад кіраўніцтвам ленінскай камуністычнай партыі вырашыла самую цяжкую і самую складаную задачу пралетарскай рэвалюцыі, пад вырашэньнем якое працавалі такія найвялікшыя геніяльныя розумы, як Маркс, Энгельс, Ленін.

Дасягнуты посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва зьяўляюцца рэзультатам правільнай палітыкі, рэзультатам няўхільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, рэзультатам няўхільнага правядзеньня індустрыялізацыі нашай савецкай краіны, калектывізацыі сельскай гаспадаркі, разгорнутага наступленьня сацыялізму па ўсім фронце на капіталістычныя элементы гораду і вёскі.

Гэтыя посьпехі дасягнуты ў бязьлітаснай барацьбе з трацкізмам, з яго буржуазнай «тэорыяй» аб немагчымасьці пабудовы сацыялізму ў адной краіне і нямінучай рэстаўрацыі капіталізму, з трацкізмам, які ператварыўся ў перадавы атрад ваяўнічай буржуазнай контр-рэвалюцыі, у бязьлітаснай барацьбе з прывым апартунізмам — галоўнай небясьпекай па даным этапе, лінія якога заключалася ў імкненьні сарваць палітыку ЦК, сарваць сацыялістычнае наступленьне на капіталістычныя элементы, у простай капітуляцыі перад кулакоў і нэпманам.

Перамогі сацыялізму дасягнуты ў бязьлітаснай барацьбе па два фронты, супроць усякіх праўленьняў апартунізму, прымірэнцтва і шпілога лібэралізму да ўхілаў ад ленінскай лініі партыі.

Цяпер усякаму ясна відаць, што нашы посьпехі, нашы перамогі, зьяўляюцца непасрэдна рэзультатам ленінскай палітыкі партыі, палітыкі ЦК, на чале з правадыром партыі і сусьветнага пралетарыяту—тав. Сталіным.

Ленін у плане палітычнай справаздачы на XI зьезьдзе партыі запісаў:

«Тры вялікія рэчы зроблены і заваяваны неадлучна. Чацьвертая і галоўная — фундамэнт сацыялістычнай эканомікі? Яшчэ не. Перарабляць шмат разоў, дробім» (Ленін, XIII, «Ленінский сборник»).

Зараз мы адзначаем, што чацьвертая і галоўная задача, пастаўленая Леніным, выкананa. Фундамэнт сацыялістычнай эканомікі мы пабудавалі.

Больш клясавай пільнасьці

На аснове нашых перамог, перамог генэральнай лініі партыі, мы можам паставіць і ў пастановах XVII усесаюзнай партканферэнцыі пастаўлі палкарнейшую ў гісторыі чалавецтва задачу пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

XVII партканферэнцыя наступным чынам фармулявала гэту задачу: «канчаткова ліквідацыя капіталістычных элементаў і клясаў наогул, поўнае зьнішчэньне прычын, якія параджаюць клясавыя розьнасьці і эксплёатацыю і перамаганьне перажыткаў капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей, ператварэньне ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва».

Рэалізацыя гэтай асноўнай палітычкай устаноўкі другой пяцігодкі — на канчаткоўю ліквідацыю капіталістычных элементаў і клясаў наогул, перамаганьне перажыткаў капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей —зразумела, патрабуе поўнага зьнішчэньня прыватнай уласнасьці па сродкі вытворчасьці, поўнага закрыцьця, ліквідацыі тых каналаў і раўчачкоў, з якіх «штодзённа і штогадзіна» параджаюцца клясы, параджаецца капіталізм. Зьнішчэньне прыватнай уласнасьці па сродкі вытворчасьці, зьнішчэньне каналаў і раўчачкоў, якія параджаюць клясы і капіталізм, — зьнішчыць матар'яльную аснову эксплёатацыі працы, зьнішчыць аснову існаваньня клясаў, прычыны, якія параджаюць клясавыя розьнасьці.

Разам з тым неабходна з усёй выразнасьцю і рэшчасьцю падкрэсьліць, што пытаньні клясавай барацьбы, пытаньні ўзмацненьня дыктатуры пралетарыяту бязьмежнасьці і ідэалёгічнай згуртаванасьці партыі, пытаньні барацьбы з ухілам ні ў якім разе не зьнімаюцца ў другой пяцігодцы.

Тав. Кагановіч на апошняй маскоўскай абласной канферэнцыі падкрэсьліў, што «ў другой пяцігодцы будуць канчаткова ліквідаваны капіталістычныя элементы і клясы наогул. Пачыста будуць вычышчаны ўсе капіталістычныя элементы, але перажыткаў і тады яшчэ застанецца шмат... Мы павінны ведаць, што нам прадстаіць яшчэ барацьба за ўмацаваньне сацыялістычнай гаспадаркі, барацьба з перажыткамі капіталізму і тут, бязумоўна, будуць яшчэ труднасьці». І далей: «супярэчнасьці ёсьць і доўга яшчэ будуць. Барацьба ёсьць і будзе, і гэта барацьба будзе мець характар барацьбы з перажыткамі капіталізму, з жулікамі, чужаедамі, хуліганамі, паразытамі, з людзьмі, якія ў сваёй сьвядомасьці, у сваіх учынках засталіся яшчэ сынкамі капіталістычнага ладу. Хіба буржуазныя тэндэнцыі ў сучасных ня ёсьць адна з такіх форм клясавай барацьбы? Так, ёсьць. Хіба ўтойванньне хлеба ў калгасах не зьяўляецца элементам клясавай барацьбы? Так, бязумоўна зьяўляецца. Вось чаму клясавая барацьба нясумненна будзе, хоць яна прыме новую форму, будзе мець новы характар. Застанецца, значыць, барацьба і ўнутры партыі з усімі і ўсякімі праўленьнямі апазыцыйных ухілаў». (Л. М. Кагановіч. — Справаздача МК на трэцяй маскоўскай абласной канферэнцыі УсеКП(б).

Разам з тым неабходна заўсёды памятаць аб тым фронце клясавай барацьбы пралетарыяту супроць капіталізму, які пралягае наміж СССР і капіталістычным сьветам; неабходна памятаць, што мы знаходзімся ў капіталістычным акружэньні, што ў барацьбе сусьветнага пралетарыяту за сусьветную камуністычную рэвалюцыю мы зьяўляемся галоўным ударным атрадам, а гэта ня толькі пратуледквае, але і настойліва патрабуе сыстэматычнай, укартай барацьбы за далейшае ўзмацненьне пралетарскай дзяржавы, не абзорнадольнасьці, не гаспадарчай і палітычнай магутнасьці.

У адкаведнасьці з усім вышэйсказаным XVII партканферэнцыя на дакладу т. т. Молатава і Куйбышава падкрэсьліла, што і «ў далейшым яшчэ пямінуча абвастрэньне клясавай барацьбы ў пасобных мэтах і асабліва ў пасобных раёнах і на пасобных вучастках сацыялістычнай будоўлі, што разам з тым падкрэсьлівае нямінучасьць захаваньня, а ў некаторых выпадках і ўзмацненьня буржуазных уплываў на пасобныя пласты і групы працоўных, нямінучасьць яшчэ на працягу доўгага часу праніканьня чужых пралетарыяту клясавых уплываў у асяродзішча рабочых, і нават у партыю. З прычыны гэтага перад партыяй стаіць задача ўзмацненьня пралетарскай дыктатуры і далейшага разгортваньня барацьбы з апартунізмам і асабліва з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай па даным этапе».

Гэтыя посьпехі дасягнуты ў бязьлітаснай барацьбе з трацкізмам, з яго буржуазнай «тэорыяй» аб немагчымасьці пабудовы сацыялізму ў адной краіне і нямінучай рэстаўрацыі капіталізму, з трацкізмам, які ператварыўся ў перадавы атрад ваяўнічай буржуазнай контр-рэвалюцыі, у бязьлітаснай барацьбе з прывым апартунізмам — галоўнай небясьпекай па даным этапе, лінія якога заключалася ў імкненьні сарваць палітыку ЦК, сарваць сацыялістычнае наступленьне на капіталістычныя элементы, у простай капітуляцыі перад кулакоў і нэпманам.

Перамогі сацыялізму дасягнуты ў бязьлітаснай барацьбе на два фронты, супроць усякіх праўленьняў апартунізму, прымірэнцтва і шпілога лібэралізму да ўхілаў ад ленінскай лініі партыі.

Цяпер усякаму ясна відаць, што нашы посьпехі, нашы перамогі, зьяўляюцца непасрэдна рэзультатам ленінскай палітыкі партыі, палітыкі ЦК, на чале з правадыром партыі і сусьветнага пралетарыяту—тав. Сталіным.

Ленін у плане палітычнай справаздачы на XI зьезьдзе партыі запісаў:

«Тры вялікія рэчы зроблены і заваяваны неадлучна. Чацьвертая і галоўная — фундамэнт сацыялістычнай эканомікі? Яшчэ не. Перарабляць шмат разоў, дробім» (Ленін, XIII, «Ленінский сборник»).

Зараз мы адзначаем, што чацьвертая і галоўная задача, пастаўленая Леніным, выкананa. Фундамэнт сацыялістычнай эканомікі мы пабудавалі.

Выкананьне народна-гаспадарчага пляну 1932 г.—важнейшая прадпасылка для вырашэньня сусьветна-гістарычных задач другой пяцігодкі

Пасьля гэтай кароткай характарыстыкі абстаноўкі, дазвольце перайсьці да асноўных стрыжнявых задач камсамолу, якія выцякаюць з сучаснай абстаноўкі, з пастаноў XVII партыйнай канферэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б. XVII партканферэнцыя адзначыла, што выкананьне народна-гаспадарчага пляну 1932 году зьяўляецца вялікшай прадпасылкай для вырашэньня сусьветна-гістарычных задач другой пяцігодкі.

Адсюль умацаваньне вядучай ролі машынабудаўніцтва, далейшае разьвіцьцё электрыфікацыі, далейшая мэханізацыя сельскай гаспадаркі, рэканструкцыя чыгуначнага транспарту, чыгун і вугаль—вось вузлавыя і стрыжнявыя задачы дня.

Якімі шляхамі мы можам вырашыць гэтыя задачы? Максымальным узьмахам прадукцыйнасьці працы, узмацненьнем сацыялістычнага накапленьня, зьнижэньнем сабекошту, перабудовай сыстэмы гаспадарча-тэхнічнага кіраўніцтва. У гэтых адносінах 6 умоў тав. Сталіна—цэльная і адзіная сыстэма мерапрыемстваў, рэалізацыя якіх павінна нам даць ня толькі выкананьне, але і перавыкананьне народна-гаспадарчага пляну 1932 г.

ЦК КП(б)Б глядзіць на нашу беларускую камсамолію, як на вярнейшага і лепшага свайго памочніка. Задачы беларускай партыйнай арганізацыі зьяўляюцца разам з тым і задачамі камсамолу, над вырашэньнем якіх павінна працаваць беларуская камсамолія.

Таму цалкам мае рацыю ЦК УсеЛКСМ, калі ў сваёй пастанове па вашым дакладзе намеціў праграму практычных мерапрыемстваў ў цясьнейшай і непарыўнай сувязі з тымі важнейшымі задачамі, якія стаяць перад усёй беларускай партыйнай арганізацыяй.

Павысіць удзел ЛКСМБ у гаспадарчым будаўніцтве

Таварышы, вы ведаеце, што беларуская вёска адзначалася ў мінулым сваёй нізкай таварнасьцю, раздробненасьцю, пазэрнасьцю значнай колькасьці хутароў, пасёлкаў. XIV зьезд КП(б)Б падвёў вынікі вялізарным дасягненьням на фронце сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі БССР. Замест адсталай раздробненай вёскі мы маем у БССР некалькі тысяч трактараў, разгорнута саўгаснае і калгаснае будаўніцтва, значную колькасьць новых МТС. Аднак, разам з гэтым неабходна ўказаць, што ў структуры пасобных галін сельскай гаспадаркі (палеводства, жывёлагадоўлі) зрухі яшчэ ня ўпна невыстарчальныя ў бок інтэнсыфікацыі, у бок павышэньня таварнасьці, невыстарчальна разгорнута яшчэ спэцыялізацыя сельскай гаспадаркі. Пастановы партыі па гэтай лініі яшчэ слаба і невыстарчальна рэалізуюцца. Адсюль задача нашага камсамолу — дапамагчы партыі ў вырашэньні асноўных задач, якія стаяць перад сельскай гаспадаркай БССР, каб што-б там ні стала дабіцца большай інтэнсыфікацыі і мэханізацыі сельскай гаспадаркі Беларусі. Трэба пабальшавіцку змагацца за павялічэньне ў структуры палеводства высока інтэнсыўных тэхнічных культур—ільну, канапель.

Барацьба за высокую ўраджайнасьць, за высокую таварнасьць, пераход ад аграмінімуму да разгорнутай праграмы агразоатэхнікі—вось практычная праграма дзеньня для нашых камсамольскіх вясковых арганізацый. Цэнтральная з цэнтральных задач усяго камсамолу і ў асаблівасьці вясковых арганізацый ЛКСМБ — гэта барацьба за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за поўную і безагаворачную рэалізацыю пастаноў ЦК УсеКП(б) ад 4 лютага 1932 году і ЦК КП(б)Б аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, а таксама аб саўгасным будаўніцтве.

Трэба, таварышы, адзначыць, што на сёнешні дзень мы маем у цэлым радзе раёнаў яўную недаацэнку важнасьці палітычнай значнасьці тэй работы, якая пастаўлена цэнтральным камітэтам партыі ў галіне арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Пытаньні правільнай арганізацыі працы ўнутры калгасу, саўгасу, пытаньні зьвязьнічыны, арганізацыі брыгад, падрыхтоўкі брыгадзіраў, пытаньне ліквідацыі абязьлічкі ўнутры калгасаў і саўгасаў, пытаньне аўладаньня ўзроснай сельска-гаспадарчай тэхнікай, пытаньне арганізацыі адыходніцтва, правільнага разьмеркаваньня даходу — яшчэ не стаяць у цэнтры ўвагі значнай колькасьці раёнаў. Ёсьць яшчэ ў некаторых раёнах і ў радзе сёл «левыя» антысяраднацкія перагібы, якія льюць ваду на млын кулака, ня ўсюды даецца належны адпор кулаку, які аказвае шалёнае супраціўленьне разгорнутаму наступленьню сацыялізму, асабліва ва ўмовах пагранічнай БССР.

Гэтыя праяўленьні апартунізму на практыцы неабходна перамагчы з усёй бальшавіцкай рашучасьцю, выгрупіць да канца.

Важнейшы шлях арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў—гэта шлях узмацненьня барацьбы з кулаком, гэта шлях максымальнай увагі пытаньням якасьці работы калгасаў, пытаньням рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна ў калгаснай і саўгаснай вытворчасьці.

Беларусь адыгрывае буйнае значэньне ў жывёлагадоўлі Савецкага Саюзу. Гэта адзін з асноўных раёнаў малочнай жывёлагадоўлі і сьвінагадоўлі. Між тым, галаданьне стада ў Беларусі праходзіць зусім нездавальняючымі тэмпамі. Камплектаваньне сьвінагадоўчых і малочных фэрм адстае ад пляну, таварны выхад прадукцыі ў іх невыстарчальны. Пытаньні, зьвязаныя з рэалізацыяй пастаноў ЦК партыі па жывёлагадоўлі, па рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна на фронце жывёлагадоўлі яшчэ не знайшлі належнага адбітку ў рабоце камсамолу.

Камсамол павінен па гэтым вучастку дапамагчы партыйнай арганізацыі выканаць і перавыканаць плян калектыўнай гадоўлі стада, выканаць і перавыканаць плян арганізацыі малочных і сьвінатаварных фэрм. Разам з гэтым трэба разгарнуць вялізарную работу па стварэньні кармовай базы ў Беларусі, шляхам пашырэньня пасеву кармовых траў, разгортваньня барацьбы за сілас і г. д.

Пастанова ЦК УсеЛКСМ правільна канцэптруе ўвагу беларускай камсамольскай арганізацыі на пытаньнях сьвінагадоўлі. Лёзунг, высунуты перад КСМ Беларусі — тону апарасу — павінен стаць стрыжнёвым лёзунгам вясковай камсамольскай арганізацыі. Выконваючы задачы, пастаўленыя партыяй у галіне жывёлагадоўлі, камсамол тым самым дапамагае партыі ў вырашэньні мясной праблемы, у вырашэньні праблемы максымальнага паляпшэньня забесьпячэньня рабочых.

Разам з тым трэба сканцэнтраваць увагу камсамольскай арганізацыі на прамысловасьці, якая пераапрацоўвае с.-гас. прадукты. Да гэтага часу маславараная, сыраваранная справа, харчасмакавая, ільнапяньковая прамысловасьць БССР знаходзіцца не на даволі выдатным месцы. Трэба, таварышы, выцягнуць гэтыя галіны прамысловасьці з задворжаў. Камсамол павінен узяць у сфэру сваёй увагі, сваёй дапамогі.

Мы, таварышы,—напярэдадні веснавой сяўбы. Пасьпяховае правядзеньне трэцяй бальшавіцкай веснавой сяўбы—гэта сур'ёзны экзамэн і беларускай партыйнай арганізацыі і беларускага камсамолу. Максымальная дапамога партыі ў пасьпяховым правядзеньні веснавой сяўбы, у пасьпяховым вырашэньні стрыжнявых задач, якія ставяцца партыяй у пэрыяд веснавой сяўбы, гэта таварышы, экзамэн сур'ёзны, камсамолу і ЦК КП(б)Б упэўнен, што камсамол вытрымае гэты экзамэн.

Камсамол яшчэ невыстарчальна дапамагае партыі ў правядзеньні раду важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній у вёсцы, кампаній па якіх адстае Беларусь, у асаблівасьці па такіх кампаніях, як лесазагатоўкі, ільназагатоўкі, дарожнае будаўніцтва, мабілізацыя сродкаў. Камсамолу трэба ўзяцца за гэтыя загары і дапамагчы партыі выканаць і перавыканаць плян ільназагатовак, лесазагатовак, дарожнага будаўніцтва і мабілізацыі сродкаў.

Пераходжу да пытаньняў прамысловасьці. Прамысловасьць Беларусі, ня гледзячы на рад буйнейшых дасягненьняў, ня гледзячы на тое, што мы апярэджваем сярэднія саюзныя тэмпы гадавога прыросту, усё-ж з году ў год значна недавыконвае свае прамфінпляны.

Барацьба за выкананьне прамфінпляну 1932 году беларускай прамысловасьці павінна стаць у цэнтры ўвагі ўсяго камсамолу і ў асаблівасьці вытворчых калектываў і ячэек ЛКСМБ.

Пастанова ЦК УсеЛКСМ правільна робіць упор на вядучыя галіны беларускай прамысловасьці: тарфяной, дрэваапрацоўчай, будматар'ялаў, лёгкай прамысловасьці, а таксама чыгуначным і дарожным транспарце.

Да пядаўнага часу ўвага да гэтых вядучых галін прамысловасьці, торфу, дрэваапрацоўкі, будматар'ялаў была яўна нездавальняючай.

Бясспрэчна, швэйная, гарбарная прамысловасьць, прамысловасьць с.-г. машынабудаўніцтва павінна мець значнае месца ў разьвіцьці беларускай прамысловасьці, але цэнтральным зьвяном на даным адрэзку зьяўляецца торф, дрэваапрацоўка, лесахомія, ільнаапрацоўчая прамысловасьць і харчовая. За гэтыя галіны партыя цяпер змагаецца, і камсамол павінен дапамагчы партыі выцягнуць гэтыя адсталыя галіны беларускай прамысловасьці.

Пытаньні работы чыгуначнага і дарожнага транспарту, выкананьня пляну перавозак, павышэньня якасьці рамонту паравозаў, вагонаў, больш рацыянальнае выкарыстаньне паравоза-вагоннага парку, выкананьне загаду тав. Андрэева — вось праграма камсамолу на чыгуначным транспарце. 100 проц. пляну дарожнага будаўніцтва — баявая задача над выкананьнем якой павінна напрацаваць уся камсамолія БССР.

Таварышы, камсамол у нас побач з сур'ёзнымі дасягненьнямі, сур'ёзнымі посьпехамі ў сваёй рабоце на лініі арганізацыі мае мае яшчэ рад буйных недахопаў. Мы яшчэ не дабіліся пагалоўнага стопроцантнага ахопу камсамолу сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам. Гаспадарча-разрахунковыя брыгады, плянава-разрахунковыя групы разгорнуты надзвычай слаба у нашай камсамольскай арганізацыі.

Пры разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, сустрэч нагэ плянаваньня, галоўным чынам захапляюцца колькасным момантам, фармальным захватам, якасны момант у радзе месц недаўлічваецца . Камсамольцы-ударнікі, сапраўдных ударнікаў, якія выконваюць свае вытворчыя заданьні яшчэ недастаткова.

Асноўным лёзунгам руху камсамолу за сустрэчнае плянаваньне, за ўдарніцтва і сацспаборніцтва ў 1932 г. павінен быць лёзунг: **«Пры даных матар'яльных сродках, на аснове большай эканоміі, лепшага выкарыстаньня вытворчых магчымасьцяй, лепшай мабілізацыі сіл і лепшага практычнага кіраўніцтва даць краіне больш прадукцыі і лепшай якасьці».** (З рэз. XVII партканф.).

У гэтым напрамку, у гэтым духу нам трэба разгортваць сустрэчнае плянаваньне, сацспаборніцтва, ударную работу.

Выкананьне і перавыкананьне народна-гаспадарчага пляну 1930 г. мае буйнейшае палітычнае і гаспадарчае значэньне, бо толькі выкананьне пляну 1932 г. мы ажыцьцявім дэзынтэграцыі партыі — «Пяцігодка за чатыры гады». Павышэньне прадукцыйнасьці працы, зьніжэньне сабекошту, цьвёрдае і няўхільнае правядзеньне гаспадарчага разрахунку, мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў, скарачэньне імпарту, правільная арганізацыя працы, перабудова ўсяго гаспадарчага і тэхнічнага кіраўніцтва ў адпаведнасьці з новымі задачамі, аўладаньне тэхнікай, рацыяналізацыя вытворчасьці і шырокае перабудова партыйнай, масава-вытворчай, камсамольскай работы ў адпаведнасьці з 6 умовамі тав. Сталіна — такая сыстэма мерапрыемстваў, рэалізаваць якія павінна дапамагчы камсамол БССР партыі.

Непрымірыма змагацца з ухіламі ў нацыянальным пытаньні

Перахожу да пытаньняў нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Нацыянальна-культурнае будаўніцтва ва ўмовах Беларусі мае выключна важнае палітычнае значэньне. На нас глядзяць ня толькі працоўныя Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны, якія стогнуць пад пятой польскага фашызму. На нас глядзяць прыгнечаныя народы калёній і поўкалёній. Разгорнутым правядзеньнем ленінскай нацыянальнай палітыкі — наша Савецкая краіна кідае кліч — заклік да ўсіх прыгнечаных капіталізмам народаў. Адсюль зусім зразумела палітычная значнасьць нацыянальна - культурнага будаўніцтва БССР. Камсамол Беларусі прарабіў значную работу ў барацьбе за нацыянальна - культурнае будаўніцтва. Ён дабіўся раду сур'ёзных посьпехаў. Пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б ленінскі камсамол павінен і ў далейшым павесьці рашучую барацьбу з праяўленьнем вялікадзяржаўнага шавінізму, які прадстаўляе галоўную небясьпеку па даным этапе, выкрываючы і выганяючы са сваіх радоў тых, хто ня хоча праводзіць бальшавіцкую нацыянальную палітыку. Адначасова камсамол павінен рашуча змагацца з рэшткамі контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму і нацыянал-апартунізму. Бяз гэтай асноўнай умовы камсамол Беларусі ня зможа вырашыць тых вялізарнейшых задач, якія перад ім паставіла партыя ў барацьбе за ажыцьцяўленьне нацыянальнай палітыкі.

Тав. Сталін у сваіх клясычных працах па нацыянальным пытаньні ня раз падкрэсьліваў, «што нацыянальнае пытаньне ёсьць частка агульнага пытаньня аб пралетарскай рэвалюцыі — частка пытаньня аб дыктатуры пралетарыяту». Бальшавікі заўсёды так і вырашалі гэту важнейшую праблему. Было-б грубейшай палітычнай памылкай прадстаўляць справу такім чынам, што нацыянальную палітыку партыі можна праводзіць ізалявана ад агульных задач сацыялістычнага будаўніцтва. Толькі на аснове барацьбы за перамогу генэральнай лініі партыі, з усякага роду апартуністычнымі скажэньнямі магчыма ажыцьцяўленьне гэтых складаненных задач. З другога боку, было-б так сама няправільным зводзіць нацыянальную палітыку партыі толькі да чыстага «культурніцтва». Гэта азначала-б штучна і зусім няправільна звужваць, выпустошваць і змазваць усю глыбіню і многагранасьць ленінскага разуменьня нацыянальнага пытаньня, недаацэньваць, яго міжнароднага значэньня. Некаторыя таварышы зводзяць пытаньне нацыянальнай палітыкі партыі да аўладаньня мовай. Бязумоўна, мова мае выключна важнае значэньне, але зводзіць толькі да гэтага нацыянальную палітыку партыі было-б глыбока няправільным.

Беларусізацыя мае буйнейшае палітычнае значэньне. Яна зьяўляецца магутнай зброяй у справе ажыцьцяўленьня кіраўніцтва пралетарыятам асноўнымі масамі сялянства, у барацьбе за нацыянальную па форме і сацыялістычную па зьмесьце культуру. Беларусізацыя ўключае ў сябе ня толькі задачу аўладаньня мовай, беларусізацыя ставіць перад партыяй задачы значна шырэй. Яна ўключае ў сябе ўвесь комплекс пытаньняў, зьвязаных з будаўніцтвам нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце культуры, такія пытаньні, як навука, друк, мастацтва і г. д. і т. п.

На фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва мы маем рад сур'ёзьнейшых недахопаў. Камсамол Беларусі ўсёй сваёй масай яшчэ не павярнуўся тварам да гэтага важнейшага вучастку.

Пры наяўнасьці значных посьпехаў у галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў БССР, наяўнасьці нясумненных посьпехаў у галіне беларусізацыі трэба адзначыць, што ў радзе партыйных і камсамольскіх ячэек назіраюцца іншы раз фармальныя, небальшавіцкія адносіны да беларусізацыі. З такімі адносінамі да важнейшага партыйнага пытаньня трэба пакончыць раз і на заўсёды. Нашай неадкладнай задачай зьяўляецца беларусізацыя работы савецкіх, прафэсіянальных, кааперацыйных арганізацый, узмацненьне беларусізацыі партыйных і камсамольскіх ячэек. Партыйны актыў увесь павінен аўладаць беларускай мовай.

КП(б)Б і пад яе кіраўніцтвам камсамол правялі вялікую барацьбу з вялікадзяржаўным шавінізмам, нацыянал-дэмакратызмам, нацыянал - апартунізмам. Перад намі стаіць задача—дабіць да канца рэшткі контр-рэвалюцыйнага нацыянал - дэмакратызму, весьці змаганьне з ухілам у бок беларускага шавінізму, весьці бязлітасную барацьбу супроць ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму — галоўнай небясьпекі. Гэта павінна зьявіцца першарадным абавязкам кожнага члена партыі і кожнага члена ЛКСМБ. Ва ўмовах БССР асаблівае значэньне мае барацьба з польскім і яўрэйскім шавінізмамі, у асаблівасьці з антысэмітызмам.

Трэба адкрыта сказаць, што на лініі нацыянальнага пытаньня былі няправільныя, памылковыя ўстаноўкі ня толькі ў камсамоле, але нават і ў партыйнай арганізацыі. XIV зьезд КП(б)Б скасаваў памылковую ўстаноўку XIII партзьезду, які кваліфікаваў, што нацыянал-дэмакратызм у Беларусі зьяўляецца галоўнай небясьпекай. Гэта ўстаноўка ішла ў разрэз з пастановамі XII і XVI зьездаў УсеКП(б), у якіх выразна ўказана, што ўхіл у нацыянальным пытаньні ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму быў, ёсьць і застаецца на даным этапе галоўнай небясьпекай.

Выразнае правядзеньне нацыянальнай палітыкі партыі, глыбокае вывучэньне ленінскай пастаноўкі нацыянальнага пытаньня, вывучэньне прац Леніна, Сталіна па нацыянальным пытаньні, рашучая і непрымірымая барацьба з ухіламі ў нацыянальным пытаньні — вось што павінна пранізаць работу камсамольскай арганізацыі. Разам з тым неабходна кожнаму камсамольцу, у тым ліку і новаму, цьвёрда памятаць, што: «інтэрнацыяналізм зьяўляецца асноўнай ідэяй, якая прасякае работу камсамолу. У гэтым яго сіла, у гэтым яго моц. Трэба, каб дух інтэрнацыяналізму лунаў над камсамолам усюды. Трэба, каб посьпехі і няўдачы ў барацьбе пралетарыяту нашай краіны дзівазаліся ў сьвядомасьці камсамольцаў з посьпехамі і няўдачамі міжнароднага рэвалюцыйнага руху. Трэба, каб нашу рэвалюцыю навучыліся разглядаць камсамольцы не як самамэту, а як сродак і падмогу для перамогі пралетарскай рэвалюцыі ва ўсіх краінах» (І Сталін «Пытаньні ленінізму», стар. 391).

Перайду да аднаго з важнейшых вучасткаў нацыянальна - культурнага будаўніцтва — да пытаньняў пралетарскага літаратурнага фронту. Камсамол яшчэ ўсур'ёз не зайняўся праблемамі пралетарскай літаратуры, БелАПП, як вядучая арганізацыя літаратурнага пралетарскага руху ў Беларусі, бязумоўна мае рад сур'ёзьнейшых дасягненьняў. За апошні час мы асабліва маем рад эрухаў у ажыцьцяўленьні важнейшых дырэктыў партыі па літаратурным фронце. Заклік ударнікаў у літаратуру зьяўляецца ленінным наказальнікам гэтых посьпехаў. Сумесная работа камсамолу і БелАПП'у дала-б магчымасьць значна шырэй разгарнуць гэты важнейшы вучастак ідэалёгічнага фронту, разгарнуць работу па ажыцьцяўленьні лёзунгу партыі за стварэньне магнітабудаў у літаратуры.

Апошняя дыскусія між камсамолам і РАПП'ам паказала узросшую актыўнасьць і патрабаваньні рабочай моладзі, якія прад'яўляюцца да нашай мастацкай літаратуры. ЦК «Правда», а таксама тав. Косараў у сваім выступленьні правільна паставілі пытаньні перад камсамольскай арганізацыяй і органамі РАПП, зьвязаными з барацьбой за пралетарскую літаратуру.

Ва ўмовах Беларусі праблема пралетарскай літаратуры набывае выключна-важнае палітычнае значэньне. Між тым, мы яшчэ ня маем з боку ЛКСМБ тэй увагі, якая павінна была быць да гэтага важнейшага вучастку нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Нашы беларускія пралетарскія пісьменьнікі і паэты, камсамольцы і партыйцы павінны даць творы вартыя нашай вялікай эпохі, вартых грандыёзных работ, якія праводзіць рабочая клясa, калгаснае сялянства, над кіраўніцтвам партыі, у барацьбе за будаўніцтва сацыялізму. Камсамол павінен быць застрольшчыкам у справе мабілізацыі ўсёй рабочай і калгаснай моладзі да пытаньняў пралетарскай літаратуры. Заклік ударнікаў у літаратуру, іх выхаваньне і г. д. немагчымы бяз шырокага ўдзелу ў гэтай рабоце ўсёй камсамольскай арганізацыі. Партыя ставіць ва ўсю шырыню перад камсамолам Беларусі задачу — канцэнтраваць сваю ўвагу на вучастках літаратурнага фронту. Не агульнымі разважаньнямі, а канкрэтнай работай камсамол павінен паказаць узоры бальшавіцкай барацьбы за стварэньне магнітабудаў у пралетарскай літаратуры.

Ня менш важныя задачы стаяць перад камсамолам БССР і ў галіне кіно, радыё і г. д. Гэтыя маруны прыклады выхаваньня і арганізацыі мас трэба скарыстаць яг[illegible], скарыстаць у напрамку [illegible] клясавай бяздольнасьці рабочай [illegible].

Чарговыя задачы работы камсамольскай арганізацыі Беларусі

Даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. ЖАБРОЎСКАГА на пленуме ЦК ЛКСМБ

Узмацніць увагу да ідэалёгічнага, навуковага фронту

Барацьба за выразнае правядзэнне лініі партыі на ідэалёгічным фронце ёсьць першарадны абавязак партыйнай і ўсёй камсамольскай арганізацыі. Пленум павінен завастрыць увагу на гэтым вучастку работы. Роля і ўдзел камсамольскай арганізацыі па ідэалёгічным фронце ніяк не адпавядаюць тым задачам, якія пастаўлены перад ім партыяй.

Ліст тав. Сталіна ў часопіс «Пролетарская революция» мае вялізарнейшае прынцыповае і палітычнае значэньне. Гэты ліст узьнімае вялізарнай важнасьці пытаньні, зьвязаныя з барацьбой за марксызм і ленінізм, з барацьбой супроць імкненьняў да скажэньня марксызму - ленінізму. Тав. Кагановіч у сваёй прамове, прысьвечанай дзесяцігодзьдзю ІЧП, адзначыў тыя асноўныя задачы, якія вынікаюць з ліста тав. Сталіна. Клясавы вораг аказвае шалёнае супраціўленьне нашаму наступленьню. Клясавая барацьба набывае рад новых форм і на ідэалёгічным вучастку. Камсамол павінен узмацніць сваю пільнасьць і сваю ўвагу да гэтага фронту клясавай барацьбы.

Тав. Сталін з бальшавіцкай выразнасьцю і непрымірымасьцю завастраў увагу на тых прыёмах працягваньня трацкісцкай кантрабанды, якія ўжываюць трацкісты. Яны імкнуцца сказіць гісторыю бальшавізму, імкнуцца кантрабандным шляхам працягнуць трацкісцкі хлам у нашы часопісы, падручнікі, бо «трацкісты ня могуць зараз выступаць пад гавебным, контр-рэвалюцыйным сьцягам Троцкага, які падхоплен зараз самымі злотымі ворагамі пралетарскай дыктатуры. А таму адкрытыя і скрытыя трацкісты падхапліваюць новы сьцяг, сьцяг люксэмбургізма, сьцяг Розы Люксэмбург, замучанай нямецкімі сацыял-дэмакратамі, каб злоўжываць ім у сваіх трацкісцкіх мэтах» (Л. М. Каганові́ч).

Гэта ўсё робіцца для таго, каб навесьці наклёп на генэральную лінію партыі, каб зноў спрабаваць правесьці рэвізію асноўных краеугольных пунктаў марксызму - ленінізму. Гнілы лібералізм раду нашых таварышоў, што працуюць на тэарытычным фронце (рэдакцыя часопісі «Пролетарская революция», Ем. Яраслаўскі — як рэдактар чатырохтомніка «Гісторыя УсеКП(б)» і інш.) даў магчымасьць трацкістам весьці сваю капітрабандную работу па фальсыфікацыі гісторыі нашай партыі. Гэта абавязвае кожнага з нас павысіць сваю бальшавіцкую пільнасьць да пытаньняў ідэалёгічнага і тэарытычнага фронту. Партыяй на тэарытычным фронце былі выкрыты буйнейшыя палітычныя і прынцыповыя памылкі, як у галіне тэарытычнай эканоміі (рубініцтвіна, памылкі Бяссонава, Кона і іншых), так і ў філёзофіі—меншавіцтвуючы ідэалізм і мэханіцызм (Дэборын, Бухарын і інш.), у галіне літаратуры, — перавярэзьцішчына, рад грубых памылак у галіне права і дзяржавы. Гэтыя памылкі былі зроблены і радам навуковых працаўнікоў БССР. Прычым у БССР мы мелі рад нахабных адкрыта-трацкісцкіх выпадзак (Югаў і інш.).

Аб чым гаворыць усе гэтыя факты. Яны гаворыць пясумненна адно, што ўвага за ідэалёгічнага навуковага фронту павінна быць узмоцнена з боку беларускай партыйнай і камсамольскай арганізацыі.

У ВПУ, ВТНУ і інш. навучальных установах мы маем значную засьмечанасьць вучнёўскага складу і нават настаўніцкіх кадраў. У радзе навучальных установаў назіраецца адрыў тэорыі ад практыкі сацыялістычнага будаўніцтва. Можна было-б прывесьці рад фактаў, якія паказваюць ненармальнасьці і прарывы, што назіраюцца ў нашых навучальных установах. Камсамол павінен правяць сабе сапраўдным памочнікам партыі ў барацьбе за надрыхтоўку сьвядомых клясава - вытрыманых пралетарскіх спэцыялістаў. ЛКСМБ павінен з уласьцівай яму энэргіяй усур'ёз заняцца ўсімі пытаньнямі, зьвязанымі з перабудовай народнай асьветы.

Я асабліва хочу завастрыць нашу ўвагу на пытаньнях, зьвязаных з палітэхнізацыяй школы. Пленум павінен прыняць усе меры да таго, каб уся арганізацыя павярнулася тварам да ажыцьцяўленьня гэтай важнейшай задачы, пастаўленай партыяй. Да гэтага часу гэта работа займала невыстарчальную ўвагу. Зусім нездавальняюча вырашаліся пытаньні, зьвязаныя з прафтэхнічнай адукацыяй. Камсамол ніяк слаба разгарнуў барацьбу за суцэльную пісьменнасьць насельніцтва. Вядое заданьне партыі аб ліквідацыі непісьменнасьці ў 1932 г. стаіць пад пагрозай зрыву. А між тым вырашэньне праблемы кадраў немагчыма без барацьбы за суцэльную пісьменнасьць, без барацьбы за марксыцка-ленінскае выхаваньне шырокіх працоўных мас. Цэнтрам перабудовы работы камсамольскай арганізацыі павінна зьявіцца барацьба за ажыцьцяўленьне лёзунгу партыі: «За культурную рэвалюцыю». Пастанова ЦК аб школе, рэалізацыя бальшавіцкіх указаньняў тав. Постышава— аб марксыцка - ленінскім выхаваньні вось адпраўныя пункты, па якіх павінна ісьці выкрашэньне праблемы аб аўладаньні вышынямі культурнага будаўніцтва.

Спалучаць штодзённыя бытавыя пытаньні з агульнымі задачамі барацьбы за сацыялізм

Ёсьць у невыстарчальная ўвага беларускага камсамолу і да пытаньняў камунальнага гаспадаркі. Пленум павінен прыцягнуць увагу ўсёй камсамольскай арганізацыі вакол задач каардынаванага палепшэньня гарадзкой гаспадаркі. Не дэкларацыямі, а жывой апэрацыйнай работай камсамол павінен узяцца за пытаньні карэннага палепшэньня работы электрастанцый, трамваяў, жыльлёвага будаўніцтва і г. д. Ён павінен памятаць, што ад палепшэньня гарадзкой гаспадаркі залежыць палепшэньне матар'яльна-бытавых умоў шырокіх працоўных мас. Партыя разгарнула вялізарную работу, зьвязаную з ажыцьцяўленьнем пастаноў чарвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) аб рэканструкцыі гарадзкой гаспадаркі. На гэтым вучастку мы дабіліся ўжо пэўных посьпехаў. Аднак, цэлы рад пытаньняў патрабуе ўзмацненьня нашай увагі. Узяць, да прыкладу, жыльлёвую каапэрацыю. Работа яе да гэтага часу застаецца нездавальняючай. Жыльлёвую каапэрацыю трэба выцягнуць на перадавыя пазыцыі. Ці прыгарадныя гаспадаркі. Камсамол гэтымі пытаньнямі амаль не займаўся. Ленін, акрэсьліваючы задачы камсамолу, асабліва завастраў увагу на непасрэднай барацьбе КСМ за арганізацыю прыгарадных і гародных гаспадарак. Ён яе высоўваў як важнейшую першачарговую задачу камсамолу. Аднак, па гэтым вучастку ЛКСМБ працуе ніяк слаба. Трэба ва ўсю шырыню паставіць праблему барацьбы за палепшэньне матар'яльна - бытавых умоў рабочай клясы. Такія пытаньні, як прыгарадныя гаспадаркі, грамадзкае харчаваньне, работа каапэрацыі, работа органаў аховы здароўя, санітарна-гігіенічныя ўмовы жыцьця рабочых камсамол павінен паставіць у цэнтры сваёй увагі. Трэба самым рашучым чынам змагацца з напляваўцельскімі адносінамі да гэтай штодзённай работы. У нас пярэдка можна пачуць разважаньні: «Што нам займацца такімі дробязямі, як прыгарадныя гаспадаркі, работа жыльлёва і г. д. У нас ёсьць больш важныя пытаньні». Гэтыя разважаньні ёсьць рэзультат неразуменьня важнейшых задач партыі. Трэба ўмець спалучаць барацьбу за дробныя штодзённыя пытаньні, зьвязаныя з палепшэньнем матар'яльна-бытавых умоў працоўных, з агульнымі задачамі барацьбы за будаўніцтва сацыялізму. Мне думаецца, што наш камсамольскі поэт Александровіч у адным са сваіх вершаў, прысьвечаных камсамолу, правільна і па-бальшавіцку паставіў задачу спалучэньня практычнай штодзённай работы з вялікімі стрыжнявымі задачамі камсамолу.

«За школу,
за лазьню,
за клюб,
За журнал,
Энэргія, воля,
Кроў,
Запал.
За кнігай помнім мы
кожнай хвілінай
дзе і якая
супроць нас краіна.
Вінтоўку трымаем
штодня пры сабе:
Жыць рэвалюцыі!
Жыць барацьбе!»

(Александровіч).

Такую думку выказаў другі камсамольскі паэт Бязыменскі ў наступных словах:

«Только тот наших дней не мельче,
только тот на нашем чути,
кто умеет в каждой мелочи
мировую революцию найти».

Вось так трэба спалучаць дробныя штодзённыя пытаньні з задачамі вялікай прынцыповай важнасьці.

Ва ўмовах Беларусі надзвычай вялікае палітычнае значэньне займаюць пытаньні, зьвязаныя з умацаваньнем абароназдольнасьці нашай савецкай краіны. Пленум ЦК ЛКСМБ правільна зрабіў, калі ўзяў шэфства над пагранічнымі часьцямі. Але трэба пажадаць, каб гэта шэфства не на было парадная формы. Трэба менш гаварыць, менш крычаць, менш займацца парадасьцю, а больш вырашаць канкрэтныя практычныя задачы, што вынікаюць з гэтых абавязацельстваў, якія ня тут узялі. Часамі бывае, што пашумяць, пашумяць і пакінуць. Неабходна лепшыя кадры камсамольцаў кінуць на гэту работу. Міжнародная абстаноўка дыктуе неабходнасьць максымальнай пільнасьці, выразнасьці, максымальнага ўмацаваньня нашай абароназдольнасьці. Пытаньнямі ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны, вялікацы камсамолу трэба сур'ёзна заняцца.

Камсамол павінен аўладаць ваеннай справай, ваеннай тэхнікай. Камсамол павінен мабілізаваць свае сілы на ўмацаваньне Чырвонай арміі, на баявую падрыхтоўку моладзі. Ён павінен выхоўваць ня толькі дасканалых байцоў арміі і флёту, а тысячы і дзесяткі тысяч тэхнічна і палітычна падрыхтаваных камандзіраў, якія ў выпадку вайны стануць на чале змагароў за сацыялізм, за пралетарскую рэвалюцыю. Гэта задача павінна быць у першую чаргу ажыцьцёўлена беларускім камсамолам.

Марксыцка-ленінскае выхаваньне—неабходная ўмова павышэньня баяздольнасьці камсамолу

Асобна хачу спыніцца на задачах росту камсамольскай арганізацыі. Толькі за апошні год усесаюзны камсамол вырас на тры з паловай мільёны чалавек. Зараз колькасьць членаў камсамолу складае каля 6 млн. Значна вырас і камсамол Беларусі. Рост камсамолу сьведчыць аб тым, што ён сапраўды зьяўляецца моцным рэзэрвам партыі, актыўным правадніком і змагаром за яе ленінскую лінію. Такі значны рост камсамолу ёсьць рэзультат і выяўленьне росту дакор'я рабочай клясы і шырокіх працоўных мас моладзі да партыі, да яе генэральнай лініі, адлюстраваньне гігантскага росту клясавай самагатоўнасьці, клясавай актыўнасьці рабочай моладзі, яе актыўнасьці ў справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Новае папаўненьне камсамолу значна пашырае і ўмацоўвае сувязі і ўплыў камсамолу па найпрэйшыя, шматмільённыя масы рабочай, калгаснай і моладзі з ВПУ, узмацняе і павышае ролю камсамолу ў барацьбе за сацыялістычную будоўлю. Неабходна гэта новае папаўненьне арганізацыйна замацаваць, палітычна выхаваць. Трэба дабіцца таго, каб ня было адсеву з камсамолу. За кожнага навічка-камсамольца, за яго перавыхаваньне ў бальшавіцкім духу трэба біцца, біцца і біцца.

У сваім выступленьні на пленуме ЦК УсеЛКСМ тав. Постышаў перад усёй камсамольскай арганізацыяй паставіў рад важнейшых прынцыповых, палітычных задач. Гэтыя ўстаноўкі партыі чавінны зьявіцца баявой праграмай дзеяньня для ленінскага камсамолу. Да нашага сораму беларуская камсамольская арганізацыя не даволі прапрацавала гэту баявую праграму партыі, по завастрыла ўвагі мас камсамольцаў і беспартыйнай моладзі па практычным ажыцьцяўленьню задач, высунутых тав. Постышавым. Новае кіраўніцтва павінна, закасаўшы рукавы, у першую чаргу прыняць меры да рэалізацыі гэтых бальшавіцкіх указаньняў. Прамова тав. Постышава дае ключ да разгортваньня ўсёй работы камсамолу, да арганізацыйнага замацаваньня і палітычнага выхаваньня радоў камсамольскай арганізацыі.

Зараз задача заключаецца ў тым, каб не фарсаваць толькі колькаснага росту камсамолу без належнага якаснага яго ўмацаваньня, а сканцэнтраваць галоўную ўвагу па асваеньні і бальшавіцкім выхаваньні новага папаўненьня, бо: «Далейшае фарсаваньне колькаснага росту без належнага якаснага яго ўмацаваньня можа прывесьці да разжыжэньня камсамолу, да сьціраньня межаў паміж камсамолам і астатняй рабочай і калгаснай моладзьдзю, да паніжэньня яго ідэйна-палітычнага ўзроўню». (П. Постышаў). Гэта, аднак, не азначае механічнага згортваньня, або закрыцьця дзьвярэй камсамолу для працоўнай перадавой актыўнай моладзі. Іменна цяпер задача заключаецца ў тым, каб ажыцьцяўляючы лёзунг 100 проц. ахвату камсамолам рабочай моладзі, не адыходзіць агулам да прыёму, а дыфэрэнцыявана вызначаць вузлавыя вядучыя вучасткі, дыфэрэнцыявана падыходзіць да прыёму ў камсамол па ніжэйшым прадпрыемстве, саўгасе, калгасе, ВПУ і г. д. Трэба рашуча змагацца з апартуністычнымі скажэньнямі правільнага лёзунгу аб 100 проц. ахвацe рабочай моладзі камсамолам. Лёзунг 100 проц. ахвату рабочай моладзі камсамолам ёсьць адлюстраваньне асноўных прынцыпаў росту камсамолу і палітычнага напрамку практыкі гэтага росту, адлюстраваньне неабходнасьці бязупыннага пралетарскага ўплыву ў саюзе. Але грубым скажэньнем зьяўляецца падмена старанной упартай масавай выхавачай работы сярод рабочай моладзі агульным суцэльным уцягваньнем усёй моладзі ў камсамол. Гэта бязумоўна прыводзіць да скажэньняў у росьце камсамольскай арганізацыі. Трэба памятаць указаньні тав. Постышава, што рост зьяўляецца поўнакаштоўным толькі тады, калі ён адбываецца па-за разрывам з ростам колькасных і якасных паказальнікаў.

Зусім зразумела, што задачы росту камсамолу і загартаваньня яго радоў.

Аўладаньне рэвалюцыйнай тэорыяй немагчыма бяз упартай практычнай штодзённай работы і барацьбы за генэральную лінію партыі. Толькі злучэньне рэвалюцыйнай тэорыі з рэвалюцыйнай практыкай забясьпечыць выхаваньне стойкіх бальшавікоў-ленінцаў.

Выхоўваючы камсамольскую масу, трэба цьвёрда ведаць і заўсёды памятаць, што «нам трэба выпрацаваць з новых кадраў камсамолу бальшавікоў, т. зн. людзей, якія ўмеюць бачыць сувязь даручанай ім справы, якой маленькай яна-б ня была, з агульна - клясавымі, агульна-дзяржаўнымі задачамі пралетарыяту, якія ўмеюць самаарганізавацца і арганізаваць другіх для давядзеньня да канца даручанай справы, якія ўмеюць перамагаць усе і ўсялякія перашкоды на шляху ажыцьцяўленьня пастаўленай перад імі задачы, якія ўсьведамляюць высокую адказнасьць за найменшае даручэньне, данае арганізацыяй, якія ўмеюць пад кіраўніцтвам партыі павесьці за сабой рабочую і калгасную моладзь, узначаліць яе і кіраваць ёю ў напружанай барацьбе за выкананьне сучасных задач будаўніцтва сацыялізму». (Постышаў).

Толькі так арганізуючы і праводзячы нашу выхаваўчую работу, мы здолеем правільна, па - бальшавіцку паставіць ленінскае выхаваньне камсамолу.

Перад ЛКСМБ зараз стаіць як асабліва важная задача — узмацненьне работы вясковага камсамолу. Цэнтральным зьвяном, за якое павінна ўхапіцца вясковая камсамольская арганізацыя, зьяўляецца задача арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Ключом да яе вырашэньня зьяўляецца рэалізацыя 6 умоў тав. Сталіна. ЦК ЛКСМБ, гарадзкой камсамольскай арганізацыі трэба ўзмацніць увагу і дапамогу вясковай камсамольскай арганізацыі па ўсёй яе рабоце. Трэба кінуць значныя кадры камсамольскага актыву на работу ў вёску. Пленум павінен вызначыць канкрэтныя шляхі, якія забясьпечваюць рэалізацыю важнейшых задач, што стаяць перад вясковай камсамольскай арганізацыяй.

Зараз камсамольская арганізацыя разгортвае вялікую работу па абмене камсамольскіх білетаў. Груба памыляюцца тыя таварышы, якія ўдаляюць сабе гэту кампанію, толькі як пераўлік. Абмен камсамольскіх білетаў ёсьць вялікая палітычная задача. Трэба гэту важнейшую палітычную кампанію выкарыстаць для павышэньня клясавай баяздольнасьці камсамолу, для павышэньня мабілізацыі мас рабочай моладзі па выкананьне канкрэтных задач сацыялістычнага будаўніцтва. Навакол гэтай кампаніі павінна быць разгорнута вялікая выхаваўчая работа, якая ў рэзультаце павінна павысіць якасьць усёй работы камсамольскай арганізацыі. Трэба самым рашучым чынам змагацца з настроямі, якія ідуць па лініі ператварэньня гэтай кампаніі ў чыстку камсамолу. Такога роду настроі нічога агульнага з установкамі партыі ня маюць.

Асобна хачу спыніцца на задачах партыйнага кіраўніцтва камсамолам у раённым і нізавым зьвяне. Парткіраўніцтва камсамолам у раённым і асабліва ў нізавым зьвяне ў радзе месц адстае ад павышаных запатрабаваньняў сёньняшняга дня. Элемэнты фармальнага кіраўніцтва цяпер абсалютна неперыймы. Жывая, штодзённая сувязь, дапамога камсамолу, канкрэтнае кіраўніцтва — вось, што нам патрэбна.

Мы не адмаўляемся ад сыстэмы партрымацваных, але асноўнае зьвяно партыкіраўніцтва камсамолам— гэта партыйная група, якая ёсьць у камсамольскай ячэйцы. З другога боку і камсамольскія арганізацыі павінны праяўляць больш ініцыятывы да пастаноўкі і вывучэньня канкрэтных пытаньняў унутры камсамольскай работы перад партыйнай арганізацыяй.

ЦК КП(б)Б пытаньням парткіраўніцтва камсамолам у раённым і нізавым зьвяне будзе аддаваць вялікую ўвагу. Мы самым рашучым чынам будзем змагацца з тымі, хто недаацэньвае парткіраўніцтва і работу камсамолу. Мы будзем правяраць работу мясцовых партыйных арганізацый па лініі парткіраўніцтва і тэй дапамогі, якую яны аказваюць камсамолу.

Партадро ў камсамоле ніяк невыстарчальнае. Трэба ўмацніць тэмпы ўцягненьня лепшай часткі камсамольцаў у партыю. У ЛКСМБ ёсьць значная праслойка стойкіх, адданых камсамольцаў. Гэтыя перадавыя элемэнты камсамолу трэба ўцягнуць у партыю. Партыйныя ядры ў камсамоле павінны цэмэнтаваць яго рады. Яны павінны зьяўляцца лепшымі правадзікамі марксыцка-ленінскага выхаваньня і бальшавіцкага ўплыву партыі ў радах камсамолу.

У беларускай арганізацыі ЛКСМ мы мелі рад вельмі адмоўных зьявішч; у практычнай рабоце камсамолу рад буйнейшых прарываў і побач з гэтым бясспрынцыпную склоку, групоўшчыну, месьніцтва, зьявішчы заціску самакрытыкі, слабасьць саюзнай дысцыпліны і г. д.

Цэнтральны камітэт партыі прызнаў неабходным абпавіць кіраўніцтва камсамолам Беларусі.

Новае кіраўніцтва павінна на аснове пастаноў партыі, на аснове частаноў ЦК УсеЛКСМ разгарнуць вялізарную работу, згуртаваць усю камсамольскую арганізацыю вакол рэалізацыі гэтых пастаноў. Новае кіраўніцтва камсамолам павінна так паставіць работу, каб падобныя зьявішчы ніколі не паўтараліся ў беларускім камсамоле. Баявая бальшавіцкая практычная работа, дапамога партарганізацыі і вырашэньне важнейшых задач сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР, барацьба за генэральную лінію партыі, барацьба з усякага роду адхіленьнямі ад яе — вось, што павінна пранізаць усе поры камсамольскай арганізацыі. Вакол практычнага ажыцьцяўленьня гэтых задач павінен згуртоўвацца беларускі камсамол і яго актыў.

Перад камсамолам Беларусі стаяць вялікія і цяжкія задачы — задачы барацьбы за аўладаньне подступамі другой пяцігодкі. Камсамол, павышаючы сваю клясавую пільнасьць, баяздольнасьць, цэмэнтуючы свае рады вакол генэральнай лініі партыі, вакол ЦК КП(б)Б зможа па-бальшавіцку забясьпечыць карэнную перабудову ўсёй сваёй работы, на аснове пастаноў XVII партканфэрэнцыі, XIV зьезду КП(б)Б і пастаноў ЦК УсеЛКСМ.

ЦК партыі ўпэўнен, што беларускі камсамол быў, ёсьць і будзе верным і лепшым памочнікам партыі ў барацьбе за бясклясавае сацыялістычнае грамадзтва, за сусьветную пралетарскую рэвалюцыю, за камунізм. (Бурныя воплескі).

VII Усебеларускі зьезд прафсаюзаў

Больш канкрэтнай дапамогі, больш апэрацыйнага кіраўніцтва

ПЕРАБУДОВАЙ ПРАФРАБОТЫ НА АСНОВЕ 6 УМОЎ т. СТАЛІНА

СПРЭЧКІ ПА ДАКЛАДУ тав. БАЯРСКАГА АБ РАБОЦЕ УсеЦСПС

Ранішняе пасяджэньне зьезду 16 сакавіка было прысьвечана спрэчкам па дакладу тав **Баярскага** аб рабоце УсеЦСПС. Выказалась 18 чалавек.

Усе выступаючыя аднадушна адзначылі вялізарнейшыя дасягненьні ў прафэсыянальным руху ў Савецкім Саюзе, заваяваныя над кіраўніцтвам партыі новым складам прэзыдыуму УсеЦСПС, у барацьбе са спадчынай былога апартуністычнага кіраўніцтва. Няўхільна праводзячы ў практыцы і тэорыі прафруху генэральную лінію партыі, даючы рашучы адпор усякім спробам апартуністаў працягнуць свае ідэйкі і «тэорыі», УсеЦСПС дабіўся значных посьпехаў, у перабудове прафсаюзнай работы, адпаведна задачам рэканструкцыйнага пэрыяду.

Вялізарныя перамогі, дасягнутыя ў індустрыялізацыі краіны, у выкананьні народна-гаспадарчых плянаў, у сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, у разгортваньні культурнай рэвалюцыі, у значнай ступені, зьяўляюцца вынікам перабудовы пад кіраўніцтвам партыі работы прафсаюзаў тварам да вытворчасьці, вынікам мабілізацыі творчага энтузіязму мас па выкананьню баявых задач сацыялістычнага будаўніцтва. Яркі прыклад гэтаму: калі ў 1929 годзе па БССР налічвалася ўдарнікаў—3 проц. агульнага ліку рабочых дык зараз ёсьць звыш 68 проц.

Тав. Кантаровіч, на прыкладзе заводу «Бальшавік» ахарактарызаваў вялікае значэньне перабудовы прафэсыянальнай работы ў адносінах выканаўзьня і перавыкананьня прамфінпляну. Чырвонасьцяжны «Бальшавік», дзе прафэсыянальная работа перанесена ў брыгады і цэхі, дзе яна падпарадкавана задачам выкананьня праграмы, з месяцу ў месяц перавыконвае прамфінплян.

Разбуйненьне прафсаюзаў, перанясеньне цэнтру цяжару прафработы ў брыгады і цэхі адыграла самую станоўчую ролю ў забясьпячэньні жывога апэрацыйнага кіраўніцтва ростам вытворчай актыўнасьці мас. У БССР уняршыню арганізаваны інстытут групоргаў у нізавым вытворчым зьвяне — брыгадзе. Разбуйнены нізавыя прафчэйкі: створана 6.555 ячэек замест 3.920 у мінулым годзе. У справаздачна - перавыбарчай кампаніі ФЗМК у 1930 годзе прымала ўдзел 1000 самаправяравачных брыгад, у 1931 годзе — 4.000.

Прафэсыянальныя арганізацыі Савецкага Саюзу за апошні год правялі вялікую работу па рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна; барацьба з абязьлічкай і ўраўнілаўкай, укараненьне гаспадачага разрахунку, далейшае паляпшэньне матар'яльна-бытавых умоў рабочых мас, перабудова работы капэрацыі, разгортваньне вышэйшых форм сацспаборніцтва і ўдарніцтва — гаспадарча-разрахунковых брыгад, сустрэчных пляноў, грамадзкага буксіру і інш., змаганьне за аўладаньне тэхнікай вытворчасьці, — знайшлі бліскучае адлюстраваньне ў значным паляпшэньні работы прамысловасьці ў 1931-1932 годзе.

На прадпрыемствах Віцебшчыны, як адзначыў у сваёй прамове дэлегат тав. **Мацьвееў**, працуюць звыш 600 гаспадарча - разрахунковых брыгад, якія паказваюць узоры вытворчай работы. Тав. **Дворкін** прыводзіць аналёгічныя прыклады работы на шэйнай фабрыцы «Камінтэрн» у Гомелі. Віцебская фабрыка імя К. Цэткін, якая ў мінулым годзе ня выконвала прамфінпляну, зараз, дзякуючы перабудове работы па-новаму, ідзе ў першых радах (з прамовы тав. **Вігдэргаўза**). На Віцебскай абутковай фабрыцы імя Лекерта арганізацыя гаспадарча-разрахунковых брыгад і паладжаньне ўліку іх работы дала значную эканомію матар'ялаў, сырцу і зьніжэньне сабекошту прадукцыі (тав. **Бэменсон**).

Вялікія посьпехі дасягнуты і ў мабілізацыі прафсаюзных мас на дапамогу сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню калгасаў — тысячы рабочых працуюць у праўленьнях калгасаў і раённых калгасаюзах. Культработа прафсаюзаў, якую былое апартуністычнае кіраўніцтва імкнулася адарваць ад барацьбы за выкананьне народна-гаспадарчых плянаў, зараз рашуча перабудоўваецца ў напрамку падпарадкаваньня яе задачам сацыялістычнага будаўніцтва (тав. **Плятнёў**).

Выступаючыя спыніліся на недахопах перабудовы кіраўніцтва з боку некаторых вышэйшых прафарганізацый. Прыведзен рад фактаў цыркуляр нага кіраўніцтва, адсутнасьці жывой сувязі з месцамі з боку пасобных ЦК саюзаў. Дэлегат зьезду тав. **Мацьвееў** (Віцебск) адзначыў, што цэнтральны камітэт саюзу сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва не наладзіў жывога апэрацыйнага кіраўніцтва работай заводу Гомсельмаш і «Чырвоны мэталіст», якія яму непасрэдна падпарадкаваны. Прадстаўнікі ЦК вельмі рэдка бываюць на заводах. Пераважвае паперовае цыркулярнае кіраўніцтва.

Аб гэтым - жа гаварыў дэлегат Аршанчычны тав. **Куксевіч**. Аршанскі льна камбінат па праўлінні непасрэдна зьвязан з цэнтральным камітэтам саюзу льняной прамысловасьці. Але якую дапамогу ён атрымлівае ад апошняга? Амаль ніякай. БелДРЭС у самы крытычны пэрыяд, калі станцыя працавала з вялікімі перабоямі, калі выключаліся адзін горад за другім, не атрымала канкрэтнай дапамогі з боку ЦК саюзу.

Бабруйскі дэлегат тав. **Гарох** прывёў прыклады з работы шкляной прамысловасьці БССР, якія сьведчаць аб адсутнасьці жывой сувязі і апэрацыйнага кіраўніцтва з боку вышэйшых прафарганізацый. Тав. Гарох узняў пытаньне аб арганізацыі ў БССР ЦК саюзу шкляной прамысловасьці. Трэба ўлічваць, што ў БССР будуецца вялікая мэханізаваная гута, на якой будуць працаваць тысячы рабочых.

Яшчэ прыклады: УсеЦСПС 4 месяцы назад выпрацаваў адзіны культплян, а прадпрыемствы яго і ў вочы ня бачылі (тав. **Кантаровіч**). Усесаюзная парада гаспадарча-разрахунковых брыгад склікаецца са значным спазьненьнем, між тым на мясцох накапіўся вялікі вопыт, які трэба было ўжо даўно падагуліць (з выступленьня тав **Каменштэйна**).

Самым «вузкім» месцам у кіраўніцтве УсеЦСПС і ЦК саюзаў зьяўляецца вучастак **перабудовы зарплаты**. Гэтая галіна прафсаюзнай работы на зьезде была жорстка раскрытыкавана

— Запытайцеся ў нашых рабочых шкляной прамысловасьці, сельгасмашына - будаўніцтва, рабочых фабрыкі «Дзьвіна», ці мелі яны выразныя дырэктывы аб перабудове зарплаты. Яны вам аднадушна адкажуць — **не. (Тав. Каменштэйн)**. У артыкулах зьмешчаных у газэце «Труд» па пытаньнях увядзеньня прагрэсыўна-пранэіяльнай зьдзельшчыны дапушчан рад блытаных, няпрамільных фармулёвак, якія толькі дэзарыентавалі нізавых прадпрадбатнікаў. Мясцом былі даны блытаныя дырэктывы па пытаньні зарплаты і нармаваньня (т. т. **Кулман, Куксевіч, Вігдэргауз** і інш.).

УсеЦСПС са значным спазьненьнем заняўся перабудовай сыстэмы зарплаты вядучых галін прамысловасьці — мэталюргічнай, камённа-вугальнай, чыгуначнага транспарту. Мала ўвагі аддана рэгуляваньню зарплаты на лёгкай прамысловасьці. Тав. **Янабсон** (Жлобін) прывёў прыклады ўраўнілаўкі заработнай платы на транспарце: сьлесар 7 разраду атрымлівае 264 руб., а машыніст 7 разраду—216 руб. На чыгуначным будаўніцтве цесьляр зарабляе 3 руб. 64 к., а чорнарабочы—5 руб. 16 кап.

Асобныя ЦК саюзаў мала цікавіліся стварэньнем кадраў нармоўшчыкаў на прадпрыемствах. Ня вылучаны заводы для ўзорнай пастаноўкі нармовачнай работы. Прафсаюзы да апошняга часу не займаліся як належыць пытаньнем замены імпартнага абсталяваньня, у прыватнасьці ліквідацыяй тых вялікіх прастояў, якія моладзі месца па радзе фабрык з-за адсутнасьці імпартных запасных частак.

І парэшце, у радзе выступленьняў закрапута пытаньне **аб перабудове культработы**. Прафарганізацыі дагэтуль мала што зрабілі, каб канкрэтна дапамагчы мясцом у правядзеньні ленінскай нацыянальнай палітыкі.

— Больш жывой сувязі і апэрацыйнага кіраўніцтва, больш канкрэтнай дапамогі нізавым прафэсыянальным зьвеньням у перабудове работы па-новаму, на аснове 6 умоў тав. Сталіна, у ажыцьцяўленьні гістарычных пастаноў 17 усесаюзнай парткапфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б —асноўныя патрабаваньні выступаўных у спрэчках дэлегатаў зьезду

Б.

Дзеньнік зьезду

Учора раніцай на зьезьдзе працягваліся спрэчкі па дакладу **тав. Рыжова**. Выступілі т. т. **Бэйнэнсон, Іофэ, Масарскі, Гусаў, Казімірчык, Зайцаў, Гэфляр, Клікновіч, Пракофьева, Барзінг, Плешакоў, Кац** і інш. Таксама выступіў народны камісар фінансаў БССР **тав. Хацкевіч**. Ён завастрыў увагу зьезду на неабходнасьці поўнага выкананьня фінпляну. Зьезд па гэтым пытаньні прыняў спэцыяльную рэзалюцыю.

Зьезд аднагалосна прызнаў палітычную лінію ЦСПСБ правільнай і практычную работу здаваньняючай. Для распрацоўкі рэзалюцыі выбрана камісія з 30 чалавек.

Ад 2.700 рабочых, работніц і ІТР Барэзінскага камбінату зьезд вітала работніца «Чырвонай Барэзіны» тав. Патаповіч. З рапартамі і прывітаньнямі выступілі таксама: ад Гомсельмашу **тав. Зялінскі**, ад заводу імя Домбаля — **тав. Шуляковуські**, ад фабрыкі «Камунарка» — **т. Пашкоўскі**, ад падшэфнай школы заводу імя Варашылава — ад 20 ФЗС **тав. Сабалеўскі**, ад гомельскіх работнікаў па ліквідацыі непісьменнасьці — **т. Міхайлаў**. На прывітаньні і рапарты адказаў член прэзыдыуму зьезду **т. Драбінс**і.

ЯПОНЦЫ ЎМАЦОЎВАЮЦЬ ПАЗЫЦЫІ Ў РАЁНЕ ШАНХАЮ

На фронт бязупынна прыбываюць транспарты са зброяй, правізіяй і войскам

Так акупанты рыхтуюцца да „міру"

ШАНХАЙ, 17. Газэта «Чайна Прэсс» паведамляе, што **японцы далей умацоўваюць свае пазыцыі ў ваколіцах Шанхаю.** З Японіі бязупынна прыбываюць ваенныя судны, транспарты выгружаюць амуніцыю. Учора некалькі японскіх знішчальнікаў прыбыло ў Шанхай. У аўторак некалькі транспартаў нагружаных правізіяй, кулямётамі і рыштункам высадзіліся ва Усуне, 2 знішчальнікі і адзін крэйсэр прыбылі ў Шанхай. Сёньня чакаецца прыбыцьцё яшчэ новых падмацаваньняў. «Чайна Прэсс» падкрэсьлівае, што 9-я дывізія і 24 брыгада японскіх войск, якім дан загад аб пагрузцы для адпраўкі ў Японію, будуць заменены 14 дывізіяй, **якая га колькасьці ў два разы перавышае 9 дывізію.** Японскія войскі, — указвае «Чайна Прэсс», — карыстаючыся аэрастатамі, штодзённа наглядаюць за прасоўваньнем кітайскіх войск у раёнах паміж Цзяндзінам і Нансінам.

Японскія пляны калёнізацыі Манчжурыі

МУКДЭН, 16. Газ. «Шонцзіншыбао» паведамляе, што японскі ўрад ужо абгаварвае пытаньні, зьвязаныя з японскай эміграцыяй у Мачжурыю. «**Эмігранты** — указвае газэта — **будуць перасяляцца ў Манчжурыю не ў адзіночным парадку, а цэльмі вёскам**», прычым у мясцох паселеньня яны змогуць стварыць свае школы і іншыя культурныя ўстановы».

Партызанскі рух у Манчжурыі расьце і мацнее

Рэзкія выпады кітайскай прэсы супроць Японіі

МУКДЭН, 16. Цзяньцзінская «Дагунбао» зьмяшчае карэспандэнцыю аб тым, як японцам удалося «украсьці» Пу-І і зрабіць яго «рогентам» Манчжурыі. Японцы — указвае газэта — фактычна акупавалі ўсю Манчжурыю, не адважваючыся дагэтуль афіцыяльна заявіць аб анэксіі гэтай тэрыторыі. Далей газэта піша, што «дзеяньні Японіі ў адносінах Манчжурыі аказаліся больш агіднымі, чым адкрытая агрэсія ці захват тэрыторыі другой дзяржавы». «Высоўваючы Пу-І ў якасьці фігуры, якая стаіць на чале незалежнасьці Манчжурыі, каб замаскаваць свае інтрыгі, — піша газэта, — **Японія дзейнічае, як баязьлівы злодзей, які баіцца жывой грамадзкай думкі.** Пакуль жывы нацыянальны дух кітайскага народу, Кітаю ня цяжка будзе справіцца з такім ідыётам, як Пу-І і з такой грабежніцкай нацыяй, як Японія». «Ня вэжна, ці пашле Кітай карную экспэдыцыю ў Манчжурыю ці ня зробіць гэтага, — піша газэта, — бо 30-млн. кітайскае насельніцтва ніколі ня прызнае панаваньня Японіі над Манчжурыяй і ўладу новага ўраду. Кітайскія зрадзікі дазволілі зрабіць з сябе цацку ў японскіх руках. Марыянэткі былі заўсёды ворагамі ўсяго кітайскага народу і так ці інакш гэтыя ворагі загінуць ад рукі верных сыноў Кітаю. Гэта паша ўпэўненасьць мацьвярджаецца тым фактам, што **расьце і мацнее народны партызанскі рух у Манчжурыі».**

Паведамленьне „дэпартаманту замежных спраў" новай манчжурскай дзяржавы

МУКДЭН, 16. 15-га сакавіка замежныя карэспандэнты атрымалі копію паведамленьня «дэпартаманту замежных спраў» новай манчжурскай дзяржавы, пасланага 12 сакавіка з Чаньчуня 17 дзяржавам, якія маюць у Манчжурыі консульскіх прадстаўнікоў. Паведамленьне пасланае наступным дзяржавам: СССР, ПАЗШ, Англіі, Францыі, Германіі, Аўстрыі, Японіі, Бэльгіі, Швэцыі, Галяндыі, Чэхаславакіі, Польшчы, Партугаліі, Эстоніі Латвіі і Літве.

Паведамленьне, пасланае Сэ Дзе-шы (міністар замежных спраў новага манчжурскага ўраду) ставіць у вядомасьць дзяржавы аб стварэньні «незалежнага» ўраду, які парваў дыпляматычныя адносіны з рэспубліканскім Кітаем. У паведамленьні ўказваецца, што новы ўрад «мае намер удасконаліць судовыя органы і заканадаўства, забясьпечыць бясьпечнасьць для насельніцтва і прыкласьці ўсе намаганьні да стварэньня дабрабыту і міру».

Што датычыць замежнай палітыкі новага ўраду, дык паведамленьне пацьвярджае ранейшыя запэўненьні ўраду, што ён будзе «падтрымліваць і замацоўваць мір, добрасумленна захоўваць абавязацельствы, якія перайшлі да яго ад рэспубліканскага Кітаю, ня будзе парушаць права чужаземцаў, што жывуць на тэрыторыі Манчжурыі, будзе абараняць іх жыцьцё і маемасьць, вітаць перасяленьне чужаземцаў у Манчжурыю на аснове раўнапраўя нацый і будзе заахвочваць гандаль з замежнымі дзяржавамі, захоўваючы прынцып «адчыненых дзьвярэй».

У заключэньне паведамленьне заклікае да ўстанаўленьня афіцыяльных дыпляматычных адносін з новай манчжурскай дзяржавай.

АМЭРЫКА І СССР

ЛЁНДАН, 16. Добра асьведомленыя колы з зацікаўленасьцю сочаць за інфармацыяй з Вашынгтону аб тым, што ўрад ПАЗШ у сувязі са становішчам на Далёкім Усходзе зьменіць магчыма сваю пазыцыю ў адносінах да Савецкага Саюзу. Паводле атрыманых у Лёндане паведамленьняў некаторыя вашынгтонскія колы абмяркоўваюць пытаньне аб прызнаньні СССР. Як указваюць, вашынгтонскія колы ня ўтойваюць, што ПАЗШ хацелі-б умацаваньня СССР, каб такім чынам шляхам прызнаньня СССР устанавіць роўнавагу сіл на Далёкім Усходзе. Як паведамляюць, вашынгтонскія колы лічаць таксама, што савецкі друк, адлюстроўваючы палітыку Крэмля, займае ў апошні час больш прыязную пазыцыю ў адносінах да ПАЗШ.

Спасылаючыся на поўныя крыніцы сьцьвярджаюць, што ўрад ПАЗШ імкнецца аднавіць прыязныя адносіны з Савецкім Саюзам і адносіны да Савецкага Саюзу як да «д'ябла», якія панавалі ў часы рэжыму Юза і Кэлёга, цяпер быццам адкінуты. Паведамляюць таксама, што за апошні час у ПАЗШ значна аслабла супраціўленьне грамадзкай думкі да палітыкі, накіраванай у карысьць прызнаньня СССР.

У добрапрайнфармаваных колах указваюць, што асноўнай перашкодай для зьбліжэньня з СССР зьяўляецца «камуністычная прапаганда» ў ПАЗШ. Сьцьвярджаюць, што наступныя 2 умовы — прызнаньне даўгоў царскага ўраду і ўраду Керанскага і гарантыі бясьпечнасьці жыцьця і маемасьці амэрыканскіх грамадзян у СССР — разглядаюцца ў вашынгтонскіх колах, як менш сур'ёзныя перашкоды для прызнаньня Злучанымі Штатамі Савецкага Саюзу.

Паводле меркаваньняў неафіцыяльных назіральнікаў, калі Злучаныя Штаты прыдуць да выводу аб тым, што зьбліжэньне з Савецкім Саюзам магчыма, першым крокам да гэтага зьбліжэньня будзе адпраўка ў СССР камісіі для перагавораў аб заключэньні гандлёвага дагавору.

На зьезьдзе францускай кампартыі

„ВЫКАНАНЬНЕ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ — ЗАБЯСЬПЕЧАНА"

Вайян Кутур'е аб сацбудаўніцтве ў СССР

ПАРЫЖ, 17. На зьезьдзе кампартыі з дакладам, прыкаваўшым усеагульную ўвагу, выступіў Вайян Кутур'е, які вярнуўся пасьля доўгай паездкі па СССР, і перадаў зьезду свае ўражаньні аб сацбудаўніцтве ў СССР. Пад бурныя воплескі зьезду Вайян Кутур'е вітае рабочых і сялян СССР і правадыра УсеКП(б) і сусьветнага пралетарыяту — **т. Сталіна.** Вайян Кутур'е падрабязна расказвае аб посьпехах выкананьня першай пяцігодкі і аб грандыёзных задачах другой пяцігодкі, **выкананьне якой таксама забясьпечана.** Ён указвае на вялізарны энтузіязм працоўных мас СССР, якія будуюць сацыялістычнае грамадзтва пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК і яе правадыра Сталіна. Вайян Кутур'е ўказаў **на поўны крах праноцтваў контр-рэвалюцыйных трацкістаў і правых апартуністаў** аб правале пяцігодкі і заклікаў зьезд прыняць неабходныя меры да сыстэматычнага азнаямленьня членаў партыі і рабочых мас Францыі з жыцьцём СССР праз друк і шляхам умацаваньня па прадпрыемствах «таварыства прыяцеляў СССР».

Пад авацыі зьезду т. Вайян Кутур'е заканчвае заклікам да стварэньня адзінага фронту для барацьбы ў абарону СССР і супроць імпэрыялістычнай вайны.

Зьезд заслухаў прывітаньне прадстаўніка германскай кампартыі. Гар. Семар, вітаючы кампартыю Германіі, заклікаў сумесна змагацца супроць вэрсальскага «падняволеньня», супроць імпэрыялістычнай вайны і супроць сацыял-фашызму (ТАСС).

НЯМА СЛОЎ, КАБ АПІСАЦЬ КАТАВАНЬНІ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ У БЕЛАПАНСКІХ ЗАСЬЦЕНКАХ

Да рабочых, сялянскай беднаты і працоўнай інтэлігенцыі

(Адкрыты ліст палітзьняволеных Лукішак)

Дарагія таварышы! Хоць тоўстыя турэмныя сьцены, хоць пільна сочаць за намі, каб не дайшла да нас вестка аб вашай гераічнай барацьбе з дагараючым капіталізмам, аднак, немагчыма стварыць такой перашкоды, якая-б не дала нам магчымасьці пільна сачыць за выкладкамі ў барацьбе з капіталізмам і думкай быць разам з вамі. Кожны выпадак — ці гэта ахвяра, загінуўшая ад рукі паліцэйскіх бандытаў, ці забастоўка, закрыцьцё фабрыкі, павялічэньне беспрацоўя, дэманстрацыі — усё гэта мы прымаем і ацэньваем, як зьвяставаньне надыходзячых рашаючых бабёў паміж пралетарыятам і буржуазіяй. У нас узмацняецца погляд, што баявы запал расьце, што недалёкі той час, калі турмы будуць адкрыты і мы разам з вамі шчыльнымі радамі пойдзем да перамогі.

Дарагія таварышы! І ў гэтых падзямельях польскага фашызму мы ні на хвіліну ня спыняем барацьбы. Становішча, якое зараз пануе ў Лукішках, можа зразумець толькі той, хто зараз гэтыя катаваньні перажывае, **бо нельга апісаць таго, якімі садыстычнымі, утончанымі мэтадамі тэрору карыстаецца ў адносінах да нас турэмная адміністрацыя. Нас стараюцца зьнішчыць фізычна і маральна.**

Харчы, якія мы атрымліваем, зьяўляюцца цыкносьнымі: бручка, морква і зноў морква, і зноў бручка — і так кожны дзень. Дапамога ад сваякоў рознымі спосабамі затрудняецца. Зараз дазваляецца толькі ў два тыдні адзін раз атрымаць харчы з волі. Прагулка скарочана да 30 хвілін. У малой адзіночнай камэры, разьлічанай на аднаго чалавека, сядзімо па двох, часта пры зачыненым вакне пры 25° цяпла. У такіх умовах чалавек задыхаецца ад недахвату сьвежага паветра.

Ужо другі год, як мы пазбаўлены права карыстацца кніжкамі і пісьмовымі прыладамі. Наша бібліятэчка, якая складалася з 3.000 томаў кніжак, — зьнішчана, раскрадзена. Сьпімо на цэмэнтовай падлозе, з прычыны чаго нашы таварышы хварэюць на рэўматызм. На прагулку ходзім малымі групкамі, так што чалавек доўгія гады асуджан не сустракацца ніколі з людзьмі.

Пазбавілі нас права пісаць лісты і атрымліваць беларускія і яўрэйскія газэты. Яўрэйскія таварышы ізаляваны ад іншых палітзьняволеных. Антысэмітныя выбрыкі і пашкі турэмшчыкаў — штодзённае зьявішча.

Праваахтары і трусы, якія спалохаліся фашызму і ўпалі перад ім на калені, як былы васол **Стагановіч** і іншыя, знаходзяцца па ўпрывілеяваным становішчы. А для нас — заўсёды карцары, цьвёрдае ложа, ізаляцыя. Калі нашы таварышы - жанчыны пры зьяўленьні пракурора ня сталі перад ім на «бачнасьць» па-вайсковаму, як ён гаворыць, дык 16 з іх былі пасаджаны ў карцар на 48 гадзін.

Дарагія таварышы! Аднак, мы не застаемся пасыўнымі авечкамі. На ўсе рэпрэсіі адказваем барацьбой. Кожны акт рапрэсіі, кожнае пазбаўленьне нас чаго-небудзь натыкаецца на згуртаваны фронт маналітнага калектыву. Толькі ў мінулым годзе галадалі мы звыш 20 дзён. Няты месяц байкатуем спатканьні са сваякамі з прычыны таго, што яны (спатканьні) даюцца праз краты, пэлы рад дэманстрацый, шмат дзён нявыхаду на прагулку, адмаўленьне ад вяшораў, абедаў і г. д.

Таварышы! У нашай барацьбе мы можам разьлічваць на перамогу толькі тады, калі будзем мець дапамогу з боку шырокіх рабоча-сялянскіх мас на волі. Таму заклікаем вас да самай энэргічнай дапамогі. Кожная наша кампанія-пратэст павінна адгукнуцца шырокім рэхам па-за турэмнымі мурамі, сярод працоўных мас.

Прэч фашысцкі турэмны рэжым!

Прэч фашысцкі ўрад!

Няхай жыве КПЗБ!

Няхай жыве сацыялістычная рэвалюцыя!

Няхай жыве рабоча-сялянскі ўрад.

Турэмны камітэт палітзьняволеных Лукішак.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

На рашаючых вучастках

ВУГАЛЬ. 15 сакавіка па Саюзе здабыта 187.663 тоны вугалю.

16 сакавіка па Данбасе здабыта 132.068 тон вугалю.

МЭТАЛЬ. 14 сакавіка па ўсіх мэталюргічных заводах Саюзу выплаўлена па 15.697 тон чыгуну і 16.814 тон сталі.

СЕЛЬГАСМАШЫНЫ. 13 сакавіка **завод імя Пятроўскага** (Хэрсон) выпусьціў 35 трактарных сярпарак; **Растоўскі завод камбайнаў** — 10 падаўкамплектаваных камбайнаў; завод **«Красная звезда»** (Зіноўеўск) — 47 трактарных сярпарак, завод **«Красный пахарь»** (Кіеў) — 25 культыватараў.

ЛЕСАПІЛЕНЬНЕ. 14 сакавіка **лесазавод імя Халтурына** расьпілаваў 249.143 кбм. сырцу, або 138,41 проц. заданьня.

15 сакавіка фанэрны завод **«Чырвоная Бярэзіна»** выпусьціў 1.698 дзесяткаў фанэрных сядзеньняў, або 100,5 проц. заданьня.

ЦЫВІКІ: 15 сакавіка дрота-цывікоўны завод **«Чырвоны Кастрычнік»** выпрацаваў 3.240 пар. будаўнічых цывікоў, або 31,3 проц. заданьня. Недавыкананьне пляну тлумачыцца недахватам дроту-катанкі.

Папера

14 сакавіка шклоўская папяровая ф-ка **«Спартак»** выпусьціла 19,9 тон паперы, або 71,65 проц. заданьня.

Абутак

15 сакавіка **віцебская абутковая фабрыка імя Лекерта** вырабіла 3.409 пар абутку, што складае 103 проц. пляну.

З 11 па 15 сакавіка фабрыкай выпушчана 12.969 пар абутку, або 98 проц. пляну.

14 сакавіка гомельская **абутковая фабрыка «Праца»** вырабіла 3.670 пар абутку — 122,33 проц. пляну, у тым ліку ботаў выпушчана 1.273 пары — 127,3 проц., мужчынскага абутку — 1.493 пары — 149,3 проц., дзіцячага абутку — 617 пар — 123,4 проц. і абутку для падросткаў — 287 пар — 57,4 проц. пляну.

За трэцюю пяцідзёнку сакавіка магілёўская **рыжарна - сядзельная фабрыка** выпусьціла прадукцыі на 70.484 руб., што складае 94 проц. пляну.

Швэйныя вырабы

15 сакавіка швэйная фабрыка **«Кастрычнік»** выпусьціла 3.645 польтаў, або 118,2 проц. заданьня. 16 сакавіка фабрыкай выпушчана 4.607 польтаў, або 159,6 проц. пляну.

За трэцюю пяцідзёнку сакавіка кушнерная фабрыка **«1мая»** выпусьціла прадукцыі на 31.361 руб., што складае 92,6 проц. пляну.

Голхавыя вырабы

За трэцюю пяцідзёнку сакавіка **віцебская голхавая фабрыка** выпусьціла прадукцыі на 34.283 руб., што складае 144,76 проц. заданьня.

Вось прадпрыемствы,

ЯКІЯ ЗРЫВАЮЦЬ УЛІК ВЫКАНАНЬНЯ ПРАМФІНПЛЯНУ

Не даслалі ў ВСНГ вестак за ўстаноўленыя тэрміны аб выкананьні месячнага пляну за першую дэкаду сакавіка наступныя прадпрыемствы:

Цагельні №№ 1, 3, 6, 8, кафляна-плітачны завод, запалкавая фабрыка «Х-ты Кастрычнік», запалкавая фабрыка «Вэзувій», друкарня імя Статіна, Палесдрук, друкарня імя молотава, «Камінтарн», бабруйская друкарня, барысаўская шпалерная фабрыка імя Вароўскага, акулярная фабрыка.

У САВЕЦЕ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

Савет Народных Камісараў БССР назначыў тав. **Міленькага** ўпаўнаважаным СНК па сплаве, на якога ўскладзена адказнасьць за забесьпячэньне пасьпяховага правядзеньня сплаўной кампаніі 1932 г.

ВУЧОНЫ і РЭВАЛЮЦЫЯНЭР

75-годзьдзе тав. А. Н. Баха

Акадэмік Аляксей Мікалаевіч **Бах** здолеў злучыць у сваёй асобе старога рэвалюцыянэра і выдатнага вучонага-біяхіміка з гучным навуковым імем. Ён нарадзіўся ў 1857 годзе ў Золатаношы, Палтаўскай губерні ў сям'і тых ваўка-вінаўцаў і ўжо будучы мінаністам у Кіеве зьвязаўся з рэвалюцыйным падпольлем. У часе «кіеўскіх унівэрсытэцкіх беспарадкаў» быў высланы у адміністрацыйным парадку у Белаазерак. У сьнежні 1881 г., вярнуўшыся з высылкі, паступіў у Кіеўскі унівэрсытэт і стаў адначасова працаваць у «Народнай волі». У гэты час ён напісаў брашуру «Царь-голод».

Аддаючы «Народнай волі» ўсю сваю рэвалюцыйную энэргію, А. Н. Бах заняў абасобленую пазыцыю ў адносінах да тэрору. Ён належаў да ліку тых многіх народавольцаў, якія цьвяроза ацэньвалі пэрспэктывы тактыкі тэрыстаў і прышлі да разуменьня тэрору толькі як аднаго са зьвеньняў рэвалюцыйнай барацьбы. Як указаў Ленін («С чего начать») тэрор адцягваў рэвалюцыйныя сілы ад галоўнай неадкладнай дзейнасьці — арганізацыі мас. Да гэтай апошняй работы і імкнуўся Бах, але, не знайшоўшы таго, чаго шукаў, у момант правалу «Народнай волі», арышту Ляпаціна, усеагульнага расчараваньня ў сувязі з дзейнасьцю праваакатараў, адышоў ад палітычнай дзейнасьці. У сакавіку 1885 г. ён выехаў за граніцу і з галавой ушоў у навуковую работу: спачатку ў Парыжы, потым у Швэйцарыі ён інтэнсыўна працаваў над найгольбейшымі праблемамі біялёгіі, як напрыклад: пытаньні дыханьня клетак.

У 1905 годзе, адчуўшы магутны пульс маскоўага рабочага руху, тав. Бах упэрыцыю горача адгукнуўся на заклік да работы і зноў зьвязваўся з рэвалюцыйным рухам. Толькі ў 1907 годзе ён вярнуўся ў Расію. Сярод усеагульнай замяшанасьці і гнёбнага сабатажу большасьці людзей навукі ён адным з першых буйных вучоных безагаворачна выступіў адданым прыхільнікам савецкай улады.

У сучасны момант акадэмік Бах — член ЦВК РСФСР, дырэктар хімічнага інстытуту імя Карпова, арганізаванага ў сьнежні 1918 г. і Біяхімічнага інстытуту НКЗ, адкрытага ў 1921 годзе.

Навуковыя работы Аляксея Мікалаевіча Баха адрозьніваюцца вялікай арыгінальнасьцю мысьленьня і ўсе вагаюць самыя актуальныя пытаньні біялёгічнай хіміі. А. М. Бах упэрыцыю даў схему пэратворэньня ім азотнай кіслоты ў азеінаргіну бялковай малекулы, ён-жа пабудаваў выдатную тэорыю марудзнага акісьленьня і хімічнай індукцыі, якая адбываецца ў гэты час. Апошнія гады ён прысьвяціў сабе раду каштоўных работ аб ферэмэнтах. Сьпіс яго вучоных работ вялікі: ён апалае звыш ста назваў. А. М. Бах заслужана выбраны у Акадэмію навук.

17 сакавіка 1932 г., увесь Саюз вітае асобе акадэміка Баха буйнага і каштоўнага працаўніка, які ўмее злучыць творчую працавітасьць і энэргію вучонага з незэплямленай рэпутацыяй старога рэвалюцыянэра, адданага рабочай клясе.

Прыняць усе меры для захаваньня жыта

ГАРАДОК. Віцебскі Саюзхлеб атрымаў з Украіны некалькі дзесяткаў вагонаў жыта, з якіх 80 вагонаў дасланы ў Гарадок для перамолу.

Сушылкі гарадоцкіх млынаў ня могуць прапусьціць такую колькасьць жыта. Склады для захаваньня прысланага жыта таксама не прыстасаваны, не ўмяшчаюць патрэбную колькасьць.

11 вагонаў выгружанага жыта ляжаць на станцыі пад адкрытым небам і псуюцца. 4 вагоны жыта ўжо зусім папсаваліся. Рэшта жыта, захаваная ў складах пры станцыі, таксама пад пагрозай псаваньня.

Апрача гэтага у Гарадок чакаецца прыбыцьцё яшчэ 74 вагонаў. Мясцовыя арганізацыі, у прыватнасьці, Саюзхлеб не падрыхтаваны да прыёмкі і перамолу гэтай колькасьці збожжа.

Патрэбна жорстка ўдарыць па віноватых у псаваньні жыта. Неабходна прыняць усе меры для захаваньня і хутчэйшага перамолу прыбываючага жыта.

Новы Белдзяржтэатр разгортвае работу

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). 15 сакавіка ў гарадзкім тэатры адбылося ўрачыстае адкрыцьцё БДТ-3.

Народны артыст рэспублікі і дырэктар тэатру тав. Галубок у сваім дакладзе даў малюнак пройдзенага шляху, праробленай працы былога вандроўнага тэатру, які зараз, пад кіраўніцтвам партыі, вырас у Беларускі Тэатр Беларускі.

БДТ-3 з пачаткам яго работы ў Віцебску віталі прадстаўнікі ад гаркому КП(б)Б, гарсавету, гарпрафсавету, фабрык, заводаў і грамадзкіх арганізацый Віцебску. Ад імя Наркамасьветы з прывітальнай прамовай выступіў старшыня Галоўмастацтва тав. Гурскі.

Вітаючы БДТ-3, прадстаўнікі партыйных, прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый заклікалі калектыў тэатру з усёй упартасьцю і бальшавіцкай энэргіяй уключыцца ў актыўную работу па ажыцьцяўленьні гістарычных пастаноў XVII партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б.

Работнікі тэатру ў адказ на прывітаньні сакаўпілі пралетарскую грамадзкасьць у тым, што ў сваёй далейшай рабоце будуць кіраўвацца ленінскую нацыянальную палітыку, змагацца за партыйнасьць у мастацтве, ствараць сапраўдныя мастацкія мастацтва.

Урачыстае пасяджэньне скончылася паказам п'есы «Энтузіясты».

Арк. Зарубежны.

Трэці Белдзяржтэатр з 1 сакавіка прыступіў да працы над новай п'есаю **«Вясна»** Ільінскага. Тэма п'есы — сацыялістычная перабудова сельскай гаспадаркі.

Выпуск п'есы прызначаецца да веснавой пасеўнай кампаніі. Яна будзе паказана ў першай палове красавіка. Для пастаноўкі п'есы «Вясна» запрошан украінскі рэжысэр тав. **Клешчэў.** Мастак — **Памфілаў.** Музыку піша дырыжэр тэатру тав. **Маркевіч.**

За час знаходжаньня тэатру ў Магілеве будзе падрыхтавана п'еса «Амэрыка» Станюўскага.

Ідэя п'есы — паказ разгорнутай клясавай барацьбы амэрыканскіх рабочых на фоне сусьветна-эканамічнага крызісу і падрыхтоўкі капіталістамі інтэрвэнцыі супроць СССР.

П'еса будзе пастаўлена ў другой палове мая.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Паведамленьні

— 19 сакавіка, у 7 гадз. веч., у Доме Камасьветы адбудзецца даклад на тэму: «Аб міжнародным становішчы і выніках прэзыдэнцкіх выбараў у Нямеччыне». Дакл. т. Засьценкер.

— 19 сакавіка, у 7 гадз. веч., у Доме Камасьветы, пакой 6, адбудзецца кансультацыя пісьменнага друку. Тэма: удзел пісьменнага друку ў веснавой пасеўнай кампаніі. Кансультант ад рэдакцыі «Раб. селькор».

— 19 сакавіка, у 8 гадз. веч., у памяшк. інстытуту гісторыі партыі (ЦК КП(б)Б, на дворе) адбудзецца пасяджэньне сакцыі гісторыі партыі т-ва гісторыкаў-марксыстаў. Запрашаюцца ўсе выкладчыкі па гісторыі партыі, асьпіранты інстытуту гісторыі і кіраўнікі гурткоў па гісторыі партыі сеткі партасьветы.

— **Партканцэлярыя ЦКК КП(б)Б** просіць зьявіцца ў ПК або паведаміць свой адрэс ці месца працы т. Старавойтава Пятра Сямёнавіча (б. Ветрынская арг.) і Белабародава Міхаіла Філімана (Выгаўскай арг.). Просьба да ўсіх арганізацый якія ведаюць месца знаходжаньня памянёных т. т., паведаміць у ПК ЦКК КП(б)Б.

— Аддзел кадраў ЦК КП(б)Б прапануе зьявіцца ў 39 пакой т. Арцюху М. Я. (б. сакратар ЦК СТУ).

— 20-III—32 г., у 6 гадз. веч., у памяшк. ЦКК-НК РСІ (Савецкая, 55, 1-шы паверх) адбудзецца пасяджэньне абкладнага бюро скаргаў ЦКК-НК РСІ з разглядам наступных скаргі: 1) скарга Жыжнецкага, 2) Смаляніцкага РВК, 3) Раянэса, 4) сафтасу імя Сушкова, 5) Акімава, 6) Маслакова, 7) заг. імя Варашылава, 8) Рощкаве, 9) Велітрамсаюзу, 10) Швойдаль, 11) базы Трактарацэнтру, 12) ф-кі імя 8 сакавіка, 13) Цэнтральная рабочай амбуляторыі. Усе т. т., якіх гэтыя справы датычаць, павінны зьявіцца. Выклікаюцца рабочыя засядацелі: Ярашэвіч, Ледвіг, Бурак — хлебазавод, Шустар, Пальчуноў, Шыфрын — фэд. «Усход», Шпілеўскі, Савіч, Гмахі — малочны завод, Простак — НДІ імя Леніна. Запрашаюцца «ЛК» і актыў.

Папраўкі

У перадавым артыкуле «Зьвязды» № 61 ад 16 сакавіка «Падрыхтоўцы да веснавой навігацыі — бальшавіцкія тэмпы», у другой калёнцы, трэцім абзацы надрукавана: «Нельга не адзначыць недапушчальнай тэндэнцыі Лесбелу зьменшыць плян перавозак супроць мінулага году на 37 проц. ЦКК-НК РСІ сваячасова выявіла гэта і прымусіла Лесбел заключыць дагавары не на 137.000 тон, як гэтага ён хацеў, а на 274.000 тон». Гэты абзац трэба чытаць так: «Нельга не адзначыць недапушчальнай тэндэнцыі Лесбелу зьменшыць плян перавозак супроць мінулага году на 37 проц. ЦКК-НК РСІ сваячасова выявіла гэта. Лесбел прымушан быў павялічыць плян перавозак па адной гомельскай прыстані на 20.000 тон, аднак і гэта павялічэньне не забясьпечвае поўнага ахопу ўмовай усяго пляну перавозак».

Ва ўчарайшым нумары «Зьвязды» ў сьпісе прэзыдыуму VII Усебеларускага зьезду прафсаюзаў украліся наступныя памылкі: прапушчана прозьвішча члена прэзыдыуму зьезду **т. Бэрзінга;** у апошнім разку складу прэзыдыуму замест Кулькін трэба чытаць **Шулькін.**

Паводле пастановы Прэзыдыуму ЦВК БССР,

нацкамісіяй ЦВК 28 сакавіка г. г. у гор. Менску

склікаецца

2-гі Усебеларускі зьезд працоўных літоўцаў.

Зьезд будзе працаваць у літоўскім клюбе — рог К. Маркса і Урыцкага.

ПАРАДАК ДНЯ ЗЬЕЗДУ:

1) Міжнароднае і ўнутранае становішча СССР (дакл. т. **Гіляновіч**).

2) Аб калектывізацыі, гаспадарча-арганізацыйным умацаваньні калгасаў і падрыхтоўцы да веснавой сяўбы (дакл. тав. **Амбрамунас**).

3) Аб культурным абслугоўваньні працоўнага літоўскага насельніцтва (дакл. тав. **Бучунас**).

На зьезд чакаецца прыезд звыш 60 дэлегатаў з вёсак і гарадоў БССР, а таксама госьці з г. г. Ленінграду, Масквы, Харкава, рабочыя з прадпрыемстваў і прадстаўнікі грамадзкіх арганізацый г. Менску.

19-га сакавіка г. г., у 6 гадзін вечара, у памяшканьні **сялі пасяджэньняў гаркому КП(б)Б**

СКЛІКАЕЦЦА

аб'яднаны пленум Менгаркому і гар. КК КП(б)Б

Парадак дня:

1. Аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы (дакл. тав. **ЯКУБОВІЧ**).

2. Аб падрыхтоўцы да будаўніцтва па прамысловасьці і камунальнай гаспадарцы (дакл. т. т. **ВАСЭРМАН і ВАЛОДЗЬКА**).

Явака членаў і кандыдатаў гаркому і гар. КК КП(б)Б на пленум абавязковая. Па першым пытаньні — сакратары вясковых парт'ячэек; па другім пытаньні — сакратары партканцэлярыяў прадпрыемстваў і будаўнічых арганізацый.

Менгарком КП(б)Б.
Мен. гар. КК КП(б)Б.

Чырвоная Зорка	Замежны фільм **САЛАМБО**
Інтэрнацыянал	Мастацкі бытавы фільм **Цудоўная кніжка**
„ПРАЛЕТАРЫ" Каса — ад 12 г. дня	**Трыпольская трагэдыя** у 7 частках.
„СПАРТАК"	**Жыцьцё на поўным ходу** камэдыя ў 6 частках.

„СЭП"?

ШТО ТАКОЕ „СЭП".

Даводзіцца даведама ўсіх курсантаў-завочнікаў

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ЗАВОЧНАЯ САЎПАРТШКОЛЫ

(Гомель) падрыхтоўчага і першага курсаў і райкомаў ад паведных партарганізацый, што на 26 сакавіка г. г., у г. Мазыры склікаецца ўстаноўчая міжраённая канфэрэнцыя завочнікаў УЗСПШ наступных раёнаў: Петрыкаўскага, Тураўскага, Жыткавіцкага, Лельчыцкага, Нараўлянскага, Каралінскага, Брагінскага, Хойніцкага, Парэчкага, Мазырскага.

На 1-га красавіка г. г. у гор. Гомелі склікаецца ўстаноўчая міжраённая канфэрэнцыя завочнікаў УЗСПШ наступных раёнаў: Рэчыцкага, Хойніцкага, Лоеўскага, Уваравіцкага, Буда-Кашалёўскага, Чачэрскага, Церахоўскага, Веткаўскага, Жлобінскага, Крычаўскага, Клімавіцкага, Любанскага, Глускага, Старадарожскага, Слуцкага, Асіпавіцкага, Пухавіцкага, Чэрвеньскага, Берозінскага, Кісьдыковіцкага, Зельвінскага, Койданскага, Гомельскага, Менскага, Бабруйскага, Карманскага, Чэрыкаўскага, Чырвонаслабодзкага, Старобінскага.

У гор. Магілеве склікаецца міжраённая ўстаноўчая канфэрэнцыя завочнікаў УЗСПШ наступных раёнаў: Лагойскага, Сялявіцкага, Плешчаніцкага, Барысаўскага, Бягомльскага, Талачынскага, Лепельскага, Чашніцкага, Сенненскага, Бешанковіцкага, Вушацкага, Дрысенскага, Расонскага, Гарадоцкага, Сураскага, Лёзьнянскага, Віцебскага, Аршанскага, Копыскага, Крупскага, Бельніцкага, Магілеўскага, Чаўускага, Горацкага, Шклоўскага, Быхаўскага, Полацкага, Прапойскага, Чырвонапольскага, Рагачоўскага, Дубровенскага. Аб трэціне скліканьня канфэрэнцыі ў Магілеве будзе абвешчана асобна.

Загадчык ЗКС УСПШ **Фрэйдпін.**

КНІГАГАНДЛЁВАЕ АБ'ЯДНАНЬНЕ

НОВАЯ КНІГА

Л. ЗІНГЕР

„ЕВРЕЙСКОЕ НАСЕЛЕНИЕ В СОВЕТСКОМ СОЮЗЕ"

Статистико-экономический обзор.

М.-Л. СОЦЭКГИЗ. 1932. Стр. 174. Ц. 2 р. 75 к.

Зьмест. 1. Яўрэйскае насельніцтва СССР паводле даных Усесаюзнага дэмаграфічнага перапісу 1926 г.—II. Навейшыя даныя аб яўрэйскім насельніцтве СССР. Выпадкі плянавай работы па далучэньні яўрэяў да зямляробчай працы і ўдзяцяньні іх у буйную прамысловасьць. Праблемы і пэрспэктывы.—III. Дадаткі: важнейшыя пастановы аб эканамічнай рабоце сярод яўрэйскай беднаты, бібліяграфічны паказчык, дыяграмы

Продаж у БССР у магазынах і аддзяленьнях кнігагандлёвага аб'яднаньня дзяржаўных выдавецтваў РСФСР.

Магілеўскі пэдагагічны тэхнікум

(г. Магілеў, Быхаўская, 16)

адкрывае прыём на завочны сэктар.

Тэрмін навучаньня — 3 гады.

На 1-шы курс завочнага сэктару прымаюцца скончыўшыя 7-годні і рэўныя ім школы.

Настаўнікі, якія ня маюць адукацыі за тэхнікум, прымаюцца ў адпаведнасьці з іх папярэдняй падрыхтоўкай (скончыўшыя адпаведныя падкурсы — на 2-гі курс, 2-гадовых падкурты — на 3-ці курс і г. д.).

Завочны сэктар дае тыя-ж самыя правы, ня і скончыўшым стацыянарны тэхнікум.

Паступаючыя на завочны сэктар павінны падаць усе дакументы, паводле плянаваньня аб прыёме ў тэхнікум, засьведчаную анкету і заяву (узоры іх разасланы ўсім райаддзелам Нарасьветы, у якіх можна падрабязна даведацца аб парадку прыёму) і дакументы аб асьвеце.

Заняткі пачнуцца (рассылка заданьняў і разьвязкі) з 1-га красавіка 1932 г.

ДЫРЭКТАР **Макарычч.**

КРУГЛЯНСКІ ВЭТЭРЫНАРНЫ ТЭХНІКУМ

абвяшчае веснавы набор на **1-шы курс тэхнікуму** 5 гад.

**6-М